© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

# Сёння ў Вышэйшым Гаспадарчым судзе разглядаецца справа аб закрыцці ПАГОНІ

ПАГОНЯ
Чацвер
27 верасня 2001 г.
№ 39 (535)
Кошт 115 рублёў

На выхадных газета атрымала папярэджанне ад абласной пракуратуры ў сувязі з публікацыяй двух артыкулаў у 36-м нумары газеты, які быў канфіскаваны ў друкарні. Нагадаем, што па факту публікацыі гэтых артыкулаў пятага верасня пракуратура распачала крымінальную справу аб паклёпе на Аляксандра Лукашэнку. Мы лічым, што такія дзеянні - гэта не толькі спроба ціску на калектыў газеты, але і на Вышэйшы Гаспадарчы суд, у якім 27 верасня павінна разглядацца справа аб закрыцці выдання. Ініцыятар закрыцця - тая самая абласная пракуратура.

З іншага боку, не выключаная магчымасць, што крымінальная справа супраць газеты можа скончыцца толькі папярэджаннем. Бо нават дылетанту ў юрыспрудэнцыі бачна, што крымінала ў публікацыях няма. З гэтай нагоды рэдактар ПАГОНІ Мікола Маркевіч наведаў начальніка следчага ўпраўлення абласной пракуратуры Станіслава Бруніна, але пасля размовы з ім у рэдактара засталося ўражанне, што следчыя маюць намер давесці справу да канца, гэта значыць, да суда. Хаця нумар газеты з так званым «паклёпам на прэзідэнта» не распаўсюджваўся і яго ніхто не чытаў, бо наклад быў арыштаваны яшчэ ў друкарні.

Нагадаем, што Гарадзенская абласная пракуратура арыштавала таксама ўсе кампутары рэдакцыі ды наклады двух нумароў выдання. Акрамя таго, адбылося выманне бухгалтарскіх дакументаў за 2001 год. Складваецца ўражанне, што дзеянні пракуратуры накіраваныя ў першую чаргу на тое, каб абцяжарыць працу журналістаў. Прычым робіцца гэта з упартасцю, вартай лепшага скарыстання. Няўжо спадарам з пракуратуры больш няма чаго рабіць?

СКАНДАЛ

## Футбалісты «Нёмана» адмаўляюцца гуляць за «Нёман»

Футбалісты гарадзенскага «Нёмана-Белкарда» могуць пакінуць каманду, так і не дагуляўшы да фінішу 11-га чэмпіянату. Каманда, якая зараз займае трэцяе месца, адчувае сур'ёзныя фінансавыя праблемы.

Яшчэ ў пачатку верасня на адрас Беларускай Федэрацыі футболу была накіраваная заява, падпісаная 20-цю футбалістамі «Нёмана». У заяве гаворыцца, што клуб вінаваты футбалістам прэміяльныя за ўвесь сезон. І ў выпадку, калі запазычанасць не будзе ліквідаваная, футбалісты просяць дазволу на прызнанне іх свабоднымі агентамі.

Тыдзень таму Гродна наведаў галоўны суддзя чэмпіянату Беларусі Юрый Савіцкі, які на працягу гадзіны меў размову з футбалістамі. Змест гэтай размовы не вядомы. Аднак ёсць звесткі, што дыялог быў накіраваны на тое, каб надзвычайная сітуацыя не набыла грамадскай агалоскі.

Паводле словаў Сяргея Саладоўнікава, галоўнага трэнера «Нёмана», кіраўніцтва клуба робіць усё магчымае, каб захаваць склад хаця б да заканчэння сезону. Адпаведна нашым дадзеным, клуб паабяцаў выплаціць запазычанасць да 30 верасня, калі павінна адбыцца чарговая гульня чэмпіянату Беларусі з «Тарпеда-МАЗ». У выпадку, калі да гэтага тэрміну з камандай не разлічацца, футбалісты не выключаюць магчымасць папярэджальнай затрымкі пачатку гульні на 10-15 хвілінаў.

Ул. інф.

## Згарэў джып дырэктара

У ноч з пятніцы на суботу ў панадворку дома №120 па вуліцы Паграанічнікаў датла згарэла машына Георгія Куранава, выканаўчага дырэктара фірмы «Гемма».

Амаль навюткі джып «Ленд ровер» загарэўся а палове на дванаццатую ночы. Агонь імгненна перакінуўся на мэрсэдэс, які стаяў побач. Калі прыехалі пажарнікі, выкліканыя пільнымі жыхарамі дома, абедзве машыны былі цалкам ахопленыя полымем. Удалося выратаваць толькі жыгулёнак, які знаходзіўся непадалёк і ледзьве не «стаў трэцім».

Зараз следства разглядае розныя версіі здарэння. Але большасць фактаў сведчыць на карысць таго, што джып быў падпалены наўмысна.

Некалькімі днямі раней падпалілі «Volkswagen Passat» выканаўчай дырэктаркі шматпрофільнага таварыства «Флінт». Гэтым разам машыну ўдалося выратаваць - абгарэлі толькі заднія колы й частка салона.

Юлія Дарашкевіч

## Сутэнёрка з газеты

30-гадовую сутэнёрку выкрылі днямі ў Гродне.

«Чароўныя і прывабныя дзяўчаты шукаюць высокааплочваемую працу» - такой аб'яў аб'яву ў газеце «Гродненская ярмарка» зазывала яна кліентаў для прастытутак. На гарадзенскую сутэнёрку заведзена справа па шэсці артыкулах крымінальнага кодэксу .

Алеся Сідлярэвіч




**28-29 верасня** - пераменная воблачнасць, уначы без ападкаў. Удзень - кароткачасовыя дажджы, вецер няўстойлівы, слабы. Тэмпература паветра 28 верасня - уначы 0...+3, удзень +9...+14; 29 верасня - уначы +2...+7, месцамі да -2, удзень +12...+17.

## Ананімныя алкаголікі адсвяткавалі юбілей

22-23 верасня ў Гродне прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя трэцяй гадавіне стварэння мясцовай суполкі ананімных алкаголікаў «Далягляд».

З гэтай нагоды Гродна наведалі прадстаўнікі суполак ананімных алкаголікаў з Брэста, Віцебска, Менска, Ліды, Шчучына і нават з Польшчы. Падчас рэгістрацыі дэлегатаў госць імпрэзы з Беластока - пан Рышард - распавёў, што ў Польшчы рух ананімных алкаголікаў існуе ўжо 25 гадоў. У адным толькі Беластоку дзейнічае 21 суполка, а ў Варшаве колькасць групаў у тры-чатыры разы болей. У Беларусі рух ананімных алкаголікаў даволі малады. Яму - 11 гадоў. У Гродне першая група паўстала тры гады таму. ПАГОНЯ паведамляла пра дзве мясцовыя суполкі ананімных алкаголікаў - «Далягляд» і «Дабравесце» (гл. ПАГОНЮ N10 ад 7 сакавіка 2001 года).

Пачаліся юбілейныя мерапрыемствы імшой у касцёле былога Брыгіцкага кляштара, а праходзілі яны ў дзіцячым летніку «Зорка», які знаходзіцца на маляўнічым узбярэжжы возера Юбілейнае. Адбыліся адкрытыя і закрытыя сходы суполак, святочны мітынг і нават дыскатэка.

Ігар Гандлеўскі

# Дапаможам выбраць старшыню гарвыканкама!

Ужо на наступны дзень пасля пераводу Анатоля Пашкевіча ў хлебапёкі ў прыёмную старшыні гарвыканкама пачалі паступаць тэлефанаванні з віншаваннямі «новаму шэфу». Называліся прозвішчы, пачынаючы ад кіраўніка Адміністрацыі Ленінскага раёна Гродна і заканчваючы дырэктарам «Хімвалакна». Сакратаркі вымушаны былі расчараваць тэлефануючых, маўляў, новы старшыня яшчэ невядомы.

Паводле інфармацыі, якая паступае з аблвыканкама, рэальных кандыдатаў на заняцце пасады Пашкевіча, як мінімум, пяцёра. Аднак, паводле словаў начальніка Упраўлення інфармацыі і друку аблвыканкама Уладзіміра Амелькі, працэс узгаднення і зацвярджэння гарадскога «вертыкальшчыка» можа цягнуцца каля месяца. Тым часам, да рэдакцыі даходзяць чуткі, што вакантную пасаду можа заняць дырэктар Гарадзенскага камбіната будматэрыялаў Леанід Лучына.

Праверыць праўдзівасць і дакладнасць гэтай інфармацыі не прадстаўляецца магчымым, бо кадравыя пытанні ў нашай краіне ўлада вырашае без уліку грамадскай думкі і не лічыць за патрэбнае паведамляць грамадзянам пра магчымых кандыдатаў на кіруючыя пасады. ПАГОНЯ не можа пагадзіцца з абуральнай несправядлівасцю - утойваннем ад жыхароў Гродна «кухні» прыняцця найважнейшых для горада рашэнняў. Таму мы прапаноўваем вам, шаноўныя чытачы, гульню.

Будзем лічыць, што Леанід Лучына - найбольш рэальны кандыдат на пасаду старшыні гарвыканкама. Вам прапануецца па тэлефоне 72-29-96 выказаць «за» ці «супраць» таго, каб ён заняў выбарную ва ўсіх цывілізаваных краінах пасаду. Вынікі нашага з вамі абмеркавання мы параўнаем з выбарам А.Лукашэнкі і Ул.Сачанкі. А раптам яны ўлічаць нашыя прапановы?

Анджэй Пісальнік

# Міністр Навумаў заклікае не даваць...

У панядзелак Гродна наведаў Уладзімір Навумаў, міністр унутраных справаў Беларусі. Так атрымалася, што візіт у наш горад стаўся для генерал-маёра першым у якасці міністра новага ўрада Беларусі. У плане наведвання Гродна былі празначаныя паездка Уладзіміра Навумава на «Азот», прыём у аблвыканкаме па асабістых пытаннях, нарада з кіраўніцтвам УУС Гарадзенскай вобласці і культурная праграма. Нягледзячы на адсутнасць у праграме візіту размовы міністра з журналістамі, ПАГОНІ ўдалося папрысутнічаць на сустрэчы Навумава з працоўным калектывам «Азота».

На «Азот» міністр унутраных справаў прыехаў разам са сваім падначаленым Анатолем Белашэўскім, начальнікам УУС аблвыканкама і Валянцінай Лаўцаль, намесніцай старшыні гарвыканкама.

Падчас кароткай традыцыйнай прамовы «аб сістэме ў нашай дзяржаве» Уладзімір Навумаў адзначыў Гарадзеншчыну. У нашай вобласці фіксуецца значна менш злачынстваў, чым на ўсходзе краіны і тлумачыцца гэта, паводле словаў міністра, нацыянальнымі традыцыямі насельніцтва.

Эмацыйная афарбоўка сустрэчы рэзка змянілася, калі супрацоўнікі «Азота» пачалі задаваць міністру пытанні. Не зважаючы на начальніка кадраў прадпрыемства, прысутнасць якога была тонка заўважана жартаўнікамі ў зале,


Уладзімір Навумаў

«азотаўцы» некалькі разоў грунтоўна прайшліся па беларускай міліцыі ды міліцыянтах. Уладзіміру Навумаву давялося нават прызнаць, што «валакіта, перадузятасць, бюракратызм, абыякавасць, неправамерная выкарыстанне фізічнай сілы» усё часцей становяцца характарыстыкамі беларускага міліцыянта.

Міністр заявіў, што камплектаванне органаў міліцыі ўжо некалькі месяцаў як спыненае. Прычына гэтаму - распрацоўка новай праграмы адбору, прыёму на службу і навучанне маладых міліцыянтаў.

Уладзімір Навумаў не стаў раскрываць падрабязнасці распрацоўваемай праграмы, але даў зразумець, што з'яўленне годнага, чалавечнага міліцыянта, які будзе дзейнічаць толькі і выключна па закону, не за грамі:

- *Я б вельмі хацеў, каб усе супрацоўнікі міліцыі былі ветлівымі і паважанымі людзьмі,* - падкрэсліў міністр.

На пытанне, «ці ставіце Вы перад прэзідэнтам пытанне барацьбы з п'янствам?», Уладзімір Навумаў даў непераканаўчы адказ:

- Калі прэзідэнт гуляе ў хакей, а ўсе з яго смяюцца - гэта і ёсць рашэнне гэтай праблемы.

А пасля словаў міністра «Вы ж не супраць, каб адзначаць вяселле з кавай і піросжнымі?» у зале ад уяўлення падобнага рашэння праблемы п'янства на секунду стала ціха.

Спыніўся Уладзімір Навумаў і на тэме хабарніцтва ў органах міліцыі. Ягоны адказ - «пакуль вы будзеце даваць - яны будуць браць» - у зале ўспрынялі па-рознаму, але толькі не як адказ міністра.

І яшчэ адзін момант. Падчас усёй сустрэчы міністр унутраных справаў настойліва імкнуўся апраўдаць дзеянні міліцыянтаў, калі рабочыя прыводзілі факты міліцэйскага беззаконня. Што і падкрэсліў супрацоўнік «Азота», які перапыніў чарговы адказ Уладзіміра Навумава:

- У тым наша хвароба, што Вы, міністр, абараняеце гонар мундзіра, а не тых людзей, якіх Вы павінны абараняць.

Павал Мажэйка

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# Маладафронтаўцы бароняць Курапаты

**Маладафронтаўцы арганізавалі кругласутачнае дзяжурства ва ўрочышчы Курапаты. Тэхніка «Белгіпрадора» - арганізацыі, што праводзіць будаўнічыя работы - пачала пляжыць зямлю і памятныя знакі на адлегласьці 50 мэтраў ад дарогі.**

**Учора было ўсталявана восем крыжоў упоперак фронту працы. Маладафронтаўцы сталі жывым ланцугом і не далі бульдозэру зруйнаваць іх. Будаўнікі выклікалі міліцыю. Але тая паглядзела ды хутка зьехала ад граху далей. На ноч быў пастаўлены намёт, каб будаўнікі не маглі рабіць сваю працу ўначы.**

**Зранку жыхары сумежных мікрараёнаў падыходзілі да маладафронтаўцаў і выказвалі спачуваньне й абурэньне, што кальцавая дарога вядзецца менавіта праз Курапаты. А 9-й гадзіне раніцы зьявіліся будаўнікі з тэхнікай, але маладафронтаўцы зноў не далі прайсьці ва ўрочышча. Увесь час там курсіравалі міліцыянты й высокія абласныя чыны, а таксама кіраўніцтва «Белгіпрадору». Размовы былі стандартныя: «У нас загад». Але маладафронтаўцы нагадвалі, што загад быў і тым, што стралялі людзей у гэтым месцы 60 гадоў таму. Зьбянтэжаныя чыноўнікі паехалі раіцца з начальствам.**

**Прэсавая служба Маладога Фронту будзе інфармаваць пра далейшае разьвіцьцё падзеяў.**

**Нацыянальны супраціў у Курапатах працягваецца!**

**Ул. інф.**




# І ўсёткі яна рухнула!

**Мяжа, якая неспадзявана для ўсіх немцаў з'явілася 13 жніўня 1961 года, падзяліла паміж сабой вялікі сучасны горад. Тры мільёны жыхароў Берліна цягам адной ночы назаўсёды пазбавіліся магчымасці сустракацца са сваімі дзецьмі, сваякамі, бацькамі, якія жылі ў суседніх дамах, на суседніх вуліцах.**

У 1962 годзе, амаль роўна праз год пасля ўзвядзеньня Берлінскай сцяны, Джон Фіцжэральд Кенэдзі, прэзідэнт ЗША падчас выступленьня ля закрытай Брандэнбургскай брамы заявіў:

- Сцяна - гэта відавочны доказ нежыццяздольнасці камуністычнай сістэмы. Мы супраць яе не толькі таму, што яна з'яўляецца гістарычнай несправядлівасцю. Мы супраць яе, таму што яна бесчалавечная. Кожны чалавек, дзе б ён ні жыў у вольным свеце, - гэта грамадзянін Берліна. Таму і я, вольны чалавек, з гонарам кажу: «Я - берлінец».

Гэта легендарнае «Ich bin ein Berliner» - «Я - берлінец» - увайшло ў гісторыю.

Памежныя загароды працягнуліся вакол Заходняга Берліна, які ў жніўні 1961 года канчаткова стаў горадам-востравам, на 155 кіламетраў. На Сцяну 2-3-мятровай вышыні пайшло больш жалезабетону, чым на ўзвядзенне новых жылых мікрараёнаў у ГДР.

Некаторыя пабудаваныя раней заходнеберлінскія станцыі метро на асобных участках праходзілі пад усходняй часткай горада. Вы ехалі з заходнеберлінскім метро - вяселле, смех, яркія фарбы, музыка - і раптам на нейкім перагоне цягнік запавольваў рух і ціха праязджаў цёмную і пустую станцыю, на пероне якой стаялі салдаты з аўтаматамі.

Пераадолець Берлінскую сцяну, рызыкуючы жыццём, спрабавалі тысячы жыхароў ГДР. Сцяну пералазілі пад агнём аўтаматаў, пераляталі на паветраных шарах, пад ёй рылі падкопы, яе таранілі на цяжкагрузах, аўтобусах, аднаго разу нават на цягніку.

Многія стэнды Музея Сцяны, які знаходзіцца непадалёк ад месца знакамітага ў Заходнім Берліне кантрольна-прапускнога пункта «Чэкпойнт Чарлі», прысвечаныя шматлікім падкопам. Іх было столькі, што сучаснікі называюць іх хутчэй так: «падкоп 28-мі», «падкоп 22-х, «падкоп 57-мі», па колькасці тых, хто здолеў перабрацца па ім на захад. Альбо, напрыклад, «падкоп пенсіянераў» ці «міжнародны падкоп» - то бок у гонар тых, хто іх рыў.

На вонкавым баку Музея прымацаваны маленечкі, амаль дзіцячы, безфюзеляжны самалёт «Ікарус». На ім два браты Бэтке, якія самі збеглі з ГДР у пачатку 80-х, злёталі з Заходняга Берліна ва Усходні за сваім братам.

Аднак, чым больш усходніх немцаў бегла на Захад, тым менш магчымасцяў лятаць заставалася ў ГДР для планерыстаўаматараў.

На ноч з маторных самалётаў, якія зазвычай выводзяць планеры ў неба, у абавязковым парадку здымаліся прапелеры, хаваліся пад замок разам са стартавымі акумулятарамі - каб ніхто не здолеў праляцець на Захад.

І ўсё ж фантазіі ўцекачоў не меншала. Адзін хаваўся ў парожнім канцэртным дынаміку, іншы - у вялізнай драўлянай кадушцы для кабеля. Жыхар Усходняга Берліна вывез сваю сяброўку з ГДР у аўтамабілі-кабрыялеце. Ён зняў адкідны верх, ветравое шкло і на хуткасці пранесся пад памежным шлагбаўмам. Яшчэ адзін маладзён пераадолеў мяжу пад вадою, змайстраваўшы з матацыкла мініяцюрную падводную лодку. Пасля ягоных уцёкаў адна з фірмаў ФРГ набыла патэнт на гэты сродак руху і пусціла яго ў серыйную вытворчасць - для аматараў падводнага плавання.

Фартуна, вядома ж, усміхалася не ўсім. Больш за 70 чалавек, а паводле іншых дадзеных, каля 240 - загінулі, спрабуючы бегчы праз Сцяну. Больш як 60 тысяч за спробы ўцёкаў адсядзелі ў ГДРаўскіх турмах. Аднак, Сцяна не магла стрымаць людзей, якія імкнуліся на Волю.

Улетку і увосень 1989 года пачаліся масавыя ўцёкі грамадзянаў ГДР на Захад. Прыехаўшы турыстамі ў Венгрыю, яны кідалі свае машыны і рэчы і пераходзілі ўжо амаль неахоўваемую мяжу з Аўстрыяй, каб потым накіравацца далей, у Заходнюю Германію.

Тысячы людзей кідалі ўсё і беглі. Уначы 9 лістапада 1989 года вялікія натоўпы людзей сабраліся перад КПП ва Усходнім Берліне. Гэдээраўскія ўлады былі вымушаныя адкрыць мяжу. Берлінская Сцяна пала.

**Падрыхтаваў**
**Павал Мажэйка**

# У Страсбургу на сэсіі Парляманцкай асамблеі Рады Эўропы адбылася дыскусія ў справе выбараў у Беларусі

**Сёньня на паседжаньні Парляманцкай асамблеі Рады Эўропы ў Страсбургу быў заслуханы даклад і адбылася дыскусія аб прэзыдэнцкіх выбарах у Беларусі.**

Дакладчык па гэтай тэме, бэльгійскі дэпутат Стэфан Горыс, а таксама дэпутаты зь Нямеччыны і Літвы гаварылі пра тое, што выбары не адпавядалі стандартам Рады Эўропы і не былі свабодныя. На адваротным настойвалі дэпутаты з Расеі й Украіны.

Ад імя дзевяці назіральнікаў Парляманцкай асамблеі Рады Эўропы, што пабывалі на выбарах у Беларусі, Стэфан Горыс зазначыў на ранішнім паседжаньні асамблеі, што выснову пра неадпаведнасьць беларускіх выбараў стандартам Рады Эўропы можна зрабіць на падставе перш за ўсё парушэньняў і нэгатыўных зьяваў у перадвыбарны пэрыяд. Сярод такіх парушэньняў ён назваў няроўныя ўмовы для кандыдатаў у сродках масавай інфармацыі, ціск на актывістаў выбарчай кампаніі й на незалежныя газэты.

Стэфан Горыс:

- Гэта дало нам падставу зрабіць выснову, што выбары не былі ні свабодныя, ні справядлівыя. Зь іншага боку, і я хачу гэта падкрэсьліць, мы заўважылі пэўныя пазытыўныя элемэнты, новыя ў беларускай сытуацыі. На ўчастках мы сустракаліся з маладымі людзьмі, студэнтамі, якія валодаюць многімі мовамі ды якія актыўна ўдзельнічалі ў выбарчай кампаніі й палітычным працэсе ў краіне.

Спадар Горыс заклікаў Раду Эўропы адмовіцца ад палітыкі далейшай ізаляцыі Беларусі й накіраваць ёй «вестку надзеі», распачаўшы дыялёг як з грамадзянскай супольнасьцю, гэтак і з уладамі. Гэта будзе азначаць новы накірунак у палітыцы Рады Эўропы ў дачыненьні Беларусі ды, як прызнаў Стэфан Горыс, ён будзе адрозьнівацца ад пазыцыяў АБСЭ і Эўрапарляманту, паколькі кожны эўрапэйскі інстытут мае сваю ўласную місію і стратэгію.

Гэты падыход ня быў цалкам падтрыманы дакладчыкам па Беларусі Вольфгангам Бэрэндтам, які заявіў, што тут патрэбна адзіны падыход Рады Эўропы, Эўразьвязу і АБСЭ. Вольфганг Бэрэндт заявіў, што гэтыя выбары маглі б засьведчыць, што Беларусь ідзе па шляху дэмакратызацыі, але шанец быў страчаны. Аднак, на думку спадара Бэрэндта, у Беларусі нараджаецца новая грамадзянская супольнасьць, якую трэба падтрымаць, таксама ўсяляк паспрыяць наладжваньню дыялёгу ўнутры беларускага грамадзтва. Спадар Бэрэндт таксама выказаўся супраць ізаляцыі Беларусі, але заклікаў патрабаваць ад беларускіх уладаў выкананьня прынцыпаў Рады Эўропы і дэмакратычных пераўтварэньняў.

Літоўскі парлямантар Вацлаў Станкевіч быў больш жорсткі. Ён адзначыў, што ў існуючых умовах пераход да дэмакратыі ў Беларусі ў блізкай будучыні ўяўляецца малаверагодным:

- Я цалкам згодны са справаздачай, што працэс выбараў у Беларусі не адпавядаў стандартам Рады Эўропы. Краіна гэтая ня можа лічыцца дэмакратычнай, хаця і былі пэўныя пазытыўныя моманты. Нягледзячы на недэмакратычны працэс, грамадзяне маглі прагаласаваць за аднаго з трох кандыдатаў.

Спадар Станкевіч заклікаў запрасіць у Парляманцкую асамблею Рады Эўропы ў якасьці гасьцей ня толькі прадстаўнікоў так званай «Палаты прадстаўнікоў», але і прадстаўнікоў апазыцыйнага боку і знайсьці для гэтага адпаведную форму.

Дэпутаты ад Расеі й Украіны, пераважна левай арыентацыі, аспрэчылі высновы, зробленыя спадарамі Горысам і Станкевічам, і заявілі, што выбары адпавядалі заканадаўству і былі вольныя.

Дыскусія пакуль вынікаў не дала. Яна паказала толькі настрой у ПА Рады Эўропы, які павінен быць улічаны Бюро асамблеі надалей.

Прадстаўнікі беларускіх дэлегацыяў, як афіцыйнай, так і апазыцыйнай, не прымалі ўдзелу ў гэтай дыскусіі. Яны сачылі за ёй з гасьцявой трыбуны.

Вынікі дыскусіі ацэньвае Анатоль Лябедзька:

- Для нас самае галоўнае, што выбары прызнаныя такімі, якія не адпавядаюць міжнародным стандартам як несправядлівыя і недэмакратычныя. Нас таксама задавальняе, што пытаньне юрыдычнай легітымнасьці Лукашэнкі знаходзіцца ў падвешаным стане.

Анатоль Лябедзька мяркуе, што ў будучых адносінах рады Эўропы і Беларусі ўсё будзе залежаць ад таго, якія захады будзе ажыцьцяўляць Аляксандар Лукашэнка і яго ўрад. Асновай для аднаўленьня статусу, адмыслова запрошанага для Беларусі, зьяўляецца спыненьне рэпрэсіяў, адмена сьмяротнага пакараньня, пашырэньне паўнамоцтваў парляманту.

Дэпутат «Палаты прадстаўнікоў» Навасяд не ўтойваў свайго задавальненьня ад тых прапановаў, якія прагучалі ў справаздачы і падчас дыскусіі:

- Ізаляцыя Беларусі штурхае яе ў склад Расейскай Фэдэрацыі. І чым больш кантактаў, у тым ліку і эканамічных, з эўрапэйскімі дзяржавамі, тым больш гарантыяў таго, што Беларусь пойдзе на дэмакратычныя пераўтварэньні.

Абедзьве дэлегацыі працягваюць сваю працу ў Старсбургу.

**Валер Каліноўскі,**
**Старсбург**
**Беларуская служба Радыё Свабоды**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



## За вашыя грошы - любы капрыз

**Адпаведна распараджэнню міністра па надзвычайных сітуацыях, абласныя Упраўленні МНС пачалі аказваць платныя паслугі насельніцтву. Па сутнасці пажарнікам загадана дамагчыся самаакупнасці. У іншых краінах такога падыходу няма. Можна лічыць, платныя паслугі пажарнікаў - беларускае ноу-хау.**

На сённяшні дзень у прэйскуранце гарадзенскіх пажарнікаў налічваецца 76 відаў паслуг. Гэта і фарбаванне балконаў, і мыццё вокнаў. Ахвотныя могуць замовіць памыўку і дробны рамонт аўтамабіляў. Як паведамілі ПАГОНІ у прэс-службе Гарадзенскага МНС, зімой пажарныя з задавальненнем зальюць коўзанкі ў мікрараёнах горада.

Пакуль што ў якасці эксперыменту платныя паслугі прадастаўляе толькі пажарная частка, якая месціцца па завулку Дзяржынскага,15. Расцэнкі паслуг вагаюцца ад 4-х да 30-ці тысяч рублёў і залежаць ад кіламетражу, які павінна пераадолець машына. Калі эксперымент апраўдаецца, дык гэтым будуць займацца ўсе пажарныя часткі, што прывядзе да зніжэння коштаў паслуг.

Як запэўніваюць пажарнікі, увядзенне платных паслуг не паўплывае на баявую здольнасць частак:

- У гаражы заўсёды знаходзіцца рэзервовая машына і баявы разлік.

**Браніслаў Сянкевіч**

## «Лукойлу» спадабаўся «Азот»?

**За падтрымку на выбарах Лукашэнка, як і абяцаў, дазволіў расейскім алігархам скупляць самыя перспектыўныя беларускія прадпрыемствы. У Гродне да ліку найбольш перспектыўных заўсёды залічвалі «Азот». Як стала вядома ПАГОНІ, адным з самых буйных беларускіх экспарцёраў зацікавілася кампанія «Лукойл».**

Расейскі капітал цікаваіцца «Азотам» ужо даўно. Вядома, напрыклад, што яшчэ з 1996 года пра набыццё прадпрыемства з кіраўніцтвам краіны вяло перамовы кіраўніцтва «Газпрама». Аднак А.Лукашэнка, спасылаючыся на недапушчальнасць марнавання нацыянальнага багацця, адмовіўся ад прапанаванай прыватызацыі. Расейскія алігархі зразумелі «цяжкасці» кіраўніка дзяржавы і вырашылі пачакаць, пакуль А.Лукашэнка «даспее». Для паскарэння працэсу «даспявання» яны пагадзіліся даваць Беларусі газ і нафту ў пазыку. Сярод філантропаў, акрамя «Газпраму», апынуліся нафтавыя кампаніі «Лукойл» і «Славнефть». Разлік надышоў пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Спецыялісты «Лукойла», якія наведалі «Азот», вывучалі сітуацыю на прадпрыемстве на працягу некалькі дзён, што выклікала ажыятаж сярод работнікаў. Справа ў тым, што ані кіраўніцтва краіны, ані кіраўніцтва «Азота» не паруліся растлумачыць працоўным, што іх чакае ў выпадку прыватызацыі прадпрыемства. Шмат каго адсутнасць інфармацыі прымусіла думаць пра кепскае. Першымі запанікавалі работнікі падведамаснай прадпрыемству сацыяльнай сферы, разумеючы, што «Лукойл», калі набудзе прадпрыемства, пачне імкнуцца пазбыцца іх, як баласту. Гэта значыць, што Палац культуры хімікаў, восем дзіцячых садкоў, шэраг інтэрнатаў, турбаза «Хімік» ды іншыя аб'екты былі б перададзеныя на баланс горада, які і так сутыкаецца з вялікімі цяжкасцямі бюджэту. Як вынік, апроч зніжкі заробкаў, людзі настроіліся на скарачэнне штату. Песімізм падмацаваўся тым, што прадпрыемства мае праблемы не толькі з абнаўленнем асноўных фондаў, знос якіх дасягнуў гранічна дапушчальнай адзнакі, але і з абаротнымі сродкамі. Такім чынам адмова прыватнага інвестара ад сацыяльнай сферы успрымаецца як непазбежная.

Тым часам, у працоўных непасрэдна на прадпрыемстве перспектыва прыватызацыі выклікае нейкі аптымізм. Яны выходзяць з таго, што прыватны капітал арыентаваны найперш на прыбытак. Таму, укладаючы грошы ў абнаўленне тэхналогіі ды абсталявання, новы гаспадар будзе праплічваць інвестыцыі з пункту гледжання атрымання прыбытку. У выпадку з «Азотам» гэта адзначае адмову ад стратнага гандлю ўгнаеннямі з калгасамі ды вяртанне на знешнія рынкі, а ў перспектыве - годныя заробкі.

Наколькі гэта прымальна для беларускага кіраўніцтва? Мяркуючы па тым, што «Лукойл» не спяшаецца абвесціць пра гатоўнасць набыць прадпрыемства, урад паставіў ўмовы, каб хоць часткова захаваць за прадпрыемствам «сацыяльную нагрузку» і субсідаванне сельскай гаспадаркі.

Адпаведна неафіцыйным дадзеным, «Лукойлу» з улікам таго, што знос асноўных фондаў «Азота» дасягае 70 працэнтаў, умовы ўраду падаліся непрымальнымі. Аднак гэта не значыць, што гандаль скончаны. Ускосным пацверджаннем з'яўляецца факт, што ў мінулы панядзелак на «аператыўцы» з удзелам начальнікаў цэхаў ды іншых кіраўнікоў «Азота» дырэктар не стрымаў абяцанне і не распавёў пра тое, якая перспектыва чакае прадпрыемства, бо ён проста там не прысутнічаў.

- Па прадпрыемству ходзяць чуткі, людзі хвалююцца. Сем гадоў таму, калі ўпершыню паўстала пытанне пра магчымасць прыватызацыі «Азота», гэта абмеркоўвалася ў працоўным калектыве. Зараз усё робіцца па-іншаму, - паведаміў карэспандэнту ПАГОНІ намеснік старшыні прафкама «Азота» Міхаіл Мікашэвіч.

**Анджэй Пісальнік**

## Мой старшыня гарвыканкама

**Больш за тыдзень жыве Гродна без кіраўніка горада. Былога старшыню гарвыканкама Анатоля Пашкевіча знялі, а новага яшчэ не прызначылі.**

Адпаведна беларускаму заканадаўству, выбіраць кіраўніка гарадской «вертыкалі» гарадзенцы не маюць права. Але сёння ПАГОНЯ прапануе ім выказацца, якога старшыню гарадзенскага гарвыканкама яны хацелі б мець.



**Наташа, правізар:**

- Я б хацела мець чэснага старшыню з вышэйшай адукацыяй, лепш эканамічнай. І ён абавязкова павінен быць гарадзенцам, добрым сем'янінам.



**Сяргей Пятровіч, інжынер-будаўнік:**

- Хацеў бы бачыць новага старшыню, не такім як Лукашэнка, каб быў разумны. Каб даваў прадпрымальнікам працаваць, за горадам глядзеў, а не слухаў, што зверху скажуць. Бо іх жа Лукашэнка прызначае, і чалавек атрымліваецца паднявольны. Трэба, каб людзі, гарадскае старшыню гарвыканкама самі выбіралі.



**Яўген Андрэевіч, кіроўца:**

- Дай Бог, каб той, хто прыйдзе на гэтае месца, за вытворчасць стаяў, за рабацяг, быў добры эканаміст і працаваў раней дзе-небудзь на заводзе, умеў унікаць у справы простых людзей.



**Лізавета Андрэеўна, пенсіянерка:**

- Спадзяюся, новым старшынём гарвыканкама прызначаць прыстойнага грамадзяніна, і ён будзе клапаціцца пра людзей і наш горад Гродна. Безумоўна, ён будзе з атачэння нашага «бацькі» Лукашэнкі.



**Валерыя Анатольеўна, галоўны бухгалтар:**

- Новы старшыня павінен сачыць перш за ўсё за чысцінёй горада, займацца адукацыяй і арганізацыяй побытавых умоваў. Чалавек ён павінен быць не сквапны, не браць сабе ў кішэню, а дбаць пра тых людзей, з якімі працуе. Абавязкова павінен мець юрыдычную і эканамічную адукацыю. Пажадана, каб працаваў у прыватным сектары. Вось такога старшыню я б выбрала, каб магла.



**Аляксей, студэнт ГрДзУ імя Я.Купалы:**

- Хацеў, каб новы кіраўнік Гродна быў бліжэй да народа, вывучаў яго праблемы і сачыў за нашым горадам, бо ён страшэнна брудны. Чалавекам ён мусіць быць разумным і энергічным, пажадана эканамістам.

**Алеся Сідлярэвіч**

## Адкрыецца школа пажылога чалавека

**З 2-га кастрычніка ў Гарадскім Цэнтры здароўя пачне працу Школа пажылога чалавека, дзе сталыя людзі змогуць атрымаць новыя веды па тое, як старэць, але не хварэць.**

- Задача ўрачоў, - гаворыць галоўны ўрач ГЦЗ Святлана Антановіч, - дапамагчы людзям у гадах перанесці ўзрост безболья, навучыць жыць паўнавартасным жыццём, правільна харчавацца і рухацца.

Падобнай гарадзенскай Школе пажылога чалавека няма пакуль што ні ў адным абласным цэнтры. Заняткі будуць арганізаваны па тэрытарыяльнаму прынцыпу: у кожнай з гарадскіх паліклінікаў фарміруюцца групы па 25 чалавек. З кожнай групай будуць працаваць герыятры, герантолагі, псіхатэрапеўты, кардыёлагі, дыетолагі, фіта-тэрапеўты. Акрамя лекцый, у курс для адной групы ўвойдзе дэманстрацыя відэафільма і раздача літаратуры.

Работу Школы пажылога чалавека плануецца зрабіць пастаяннай.

**Алена Сіневіч**

## Віншаванні з горкім прысмакам

**У актавай зале Палаца моладзі адбыўся святочны вечар, прысвечаны ўшанаванню маладых педагогаў напярэдадні іх прафесійнага свята. Яго арганізатарамі выступілі супрацоўнікі Дома настаўніка, што месціцца ў Гродне па вуліцы Тызенгаўза,5, а таксама Гарадскі камітэт прафсаюза і органы кіравання адукацыяй.**

19 верасня ў Палацы моладзі сабралося каля ста маладых спецыялістаў-выпускнікоў вышэйшых навучальных установаў Беларусі, якія ў гэтым годзе папоўнілі шэрагі настаўнікаў гарадзенскіх школаў. Арганізатары свята сустракалі запрошаных шчырымі ўсмешкамі ды цёплымі словамі. Кожны з гасцей атрымаў сціплы падарунак - асадку і маленькі нататнік, у якім былі змешчаныя віншаванні, кантактныя тэлефоны прафсаюзных органаў і словы «Гімна настаўнікам!»

Увазе маладых настаўнікаў былі прапанаваныя выступленні вакальных і танцавальных калектываў Гарадзеншчыны. Перад моладдзю выступілі прадстаўнікі аддзела адукацыі гарвыканкама, настаўнікі-ветэраны.

Апошнімі ўзялі слова старшыня Гарадзенскага гаркама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Данута Макей і яе намесніца Людміла Саўко. Але з іх вуснаў маладыя педагогі не пачулі ўзнёслых словаў віншаванняў і марных спадзяванняў на светлую будучыню, якой так чакаюць беларускія настаўнікі. Данута Макей і Людміла Саўко з болем і жалем у голасе распавялі моладзі пра матэрыяльна і сацыяльна складаныя ўмовы, у якіх знаходзяцца работнікі сферы адукацыі, на фоне сталага збяднення беларускага народа і крызіснага становішча эканомікі нашай краіны. Яны казалі пра тое, што законы, якія падпісвае прэзідэнт Беларусі, часцяком не абараняюць, а наадварот, прыгнятаюць іх правы. Былі прыведзеныя і некаторыя статыстычныя дадзеныя. Так, напрыклад, сярэдні заробак работнікаў адукацыі па Беларусі ў студзені-чэрвені 2001 года склаў толькі 68 працэнтаў ад сярэдняга заробку ў галіне прамысловасці.

Данута Макей выказала толькі адно спадзяванне - пра тое, што калі-небудзь настаўнік усё-ткі будзе без страху глядзець у заўтрашні дзень. Спадзяванні... Зноў спадзяванні... А якая ж рэальнасць?

Большасць маладых настаўнікаў гарадзенскіх школаў, якія прыйшлі на працу ў гэтым навучальным годзе, не атрымалі авансу за верасень.

- Па закону маладым спецыялістам не прадугледжана выплата авансу ў першы месяц працы, - паведамілі нам у бухгалтэрыі аддзела адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна, - і што першы свой заробак яны атрымаюць толькі напачатку кастрычніка (але ж большасць маладых педагогаў выйшла на працу яшчэ 15 жніўня - **заўвага аўт.**).

Вось і атрымоўваецца, што ўжо больш за месяц былое студэнцтва працаваць-працуе, а харчуецца святым духам ды маладзевым энтузіязмам, і яшчэ два тыдні працаваць будзе.

Хочацца звярнуцца з пытаннем да кіраўнікоў шматлікіх аддзелаў адукацыі розных узроўняў: няўжо вы думаеце, што былыя студэнты, а зараз - маладыя спецыялісты, якія ў жніўні сумленна выйшлі па размеркаванню на свае працоўныя месцы ў гарадзенскіх школах, могуць каля двух месяцаў абыходзіцца без ежы ды іншых жыццёва неабходных рэчаў? З якімі пачуццямі прымаюць яны вашыя марныя святочныя віншаванні? Ці не адчуваеце вы ў сваіх словах горкі прысмак?

## Грыбны дожджык прыносіць смерць

**Днямі атруціўся грыбамі і памёр беспрацоўны гарадзенец Сяргей Д. Ён наеўся недаваранных грыбоў, якія называюцца курачкі. Праз пяць дзён звярнуўся ў шпіталь, аднак дапамагчы яму ўжо нічым не здолелі.**



У гэтым месяцы на Гарадзеншчыне ад атручвання грыбамі людзей памерла болей, чым за ўвесь мінулы год. З пачатку восені загінула тры чалавекі, а на працягу 2000 года - адзін.

Наша вобласць - агульнабеларускі лідар па колькасці выпадкаў атручвання грыбамі.

- З пачатку года, - **паведаміў ПАГОНІ Міхаіл Кахановіч**, лекар-гігіеніст аддзялення гігіены харчавання Гарадзенскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, - у нашай вобласці зафіксавана 95 пацярпелых ад атручвання грыбамі.

Найбольш труцяцца грыбамі ў Гродне - 49 выпадкаў, Гарадзенскім - 8, Смаргонскім (7) і Дзятлаўскім (4) раёнах. Сем чалавек медыкам выратаваць не ўдалося (па аднаму - у Наваградскім, Свіслацкім, Астравецкім, Дзятлаўскім, Ашмянскім раёнах і двух загінуўшых у горадзе Гродна). За Гарадзеншчынай, адпаведна дадзеным Рэспубліканскага цэнтра здароўя, ідзе Магілёўская (39 пацярпелых, пяць з іх памерлі) і Гомельская вобласці (з 23 пацярпелых чацвёра загінулі).

Росту колькасці атручванняў спрыяе і сёлетняе дажджлівае ды цёплае надвор'е, якое дало ў Беларусі вялікі ўраджай грыбоў.

**Юрый Апановіч, загадчык аддзялення вострых атручванняў бальніцы хуткай дапамогі**, кажа, што рэзкія болі ў жываце і панос - галоўныя характэрныя прыкметы атручвання грыбамі. Большасць памерлых, паводле яго слоў, ужывалі белую паганку.

- Гэта самы атрутны грыб. Адной чвэрці шапачкі дастаткова для смяротнага атручвання. Паганку часта блытаюць з сыраежкамі і шампіньёнамі, - **тлумачыць лекар-гігіеніст Гарадзенскага гарадскога Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Таццяна Хартановіч**. - Асноўныя прыкметы белай паганкі - своеасаблівыя манжэткі на верхняй частцы ножкі, а таксама патаўшчэнне ў выглядзе клубня ля кораня грыба.

Труцяцца і іншымі ядавітымі грыбамі: непраўдзівымі апенькамі і мухаморамі. Акрамя іх, як адзначае Таццяна Хартановіч, атручванне могуць выклікаць і ўмоўна ядомыя грыбы - смаржкі і страчкі, неправарaныя свінаркі, непрасоленыя ваўнянкі, бялянкі, а таксама «двайнік» белага - жоўцевы грыб.

- Падчас чысткі грыбы абавязкова трэба пакаштаваць - лізнуць ножку. Калі адчуваеце гаркату, значыць, грыб атрутны, - раіць спадар Апановіч. - Нельга збіраць старыя грыбы, яны змяшчаюць высокатаксічныя рэчывы. Усе грыбы абавязкова трэба вымочваць, адварваць і ўжываць адразу пасля перапрацоўкі. Нядаўна да нас паступіла сям'я з Сапоцкіна, якая атруцілася свінаркамі, бо ела іх нязваранымі, а толькі засоленымі. Самы надзейны спосаб загатоўкі грыбоў - сушка.

Грыбы - прадукт цяжкі для страўлення. Таму лекары не раяць ужываць грыбы людзям з захворваннямі печані, нырак і стрававальна-кішэчнага тракту на ноч і разам з мясам ці рыбай, а таксама дзецям да 6-гадовага ўзросту.

**Марыя Тапільская**

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# Палякі выбралі парламент

**Вынікі парламенцкіх выбараў у Польшчы стварылі новую палітычную рэальнасць.**

Ацэньваючы па гарачых слядах парламенцкія выбары ў Польшчы, можна зрабіць дзве высновы. Першая: як і чакалася, найбольшую фракцыю ў Сейме створаць левыя з блоку Саюз дэмакрытычных левых - Унія працы (SLD-UP). Другая: польскае грамадства радыкалізавалася, праявай чаго сталася ўваходжанне ў Сейм партыйна-папулісцкай радыкальнай «самаабароны» Анджэя Леппера і «Лігі польскіх сем'яў», якія набралі каля 18 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў.

У Сейм не патрапілі партыі правячай кааліцыі Акцыя выбарча «Салідарнасць» і «Унія свабоды». На іх думку, гэта кошт за чатырохгадовыя рэформы, якія праводзіла правацэнтрысцкая кааліцыя. Дзве з іх - пенсійная і рэформа аховы здароўя - сталіся правальнымі. Абцяжарыла і без таго незайздроснае перавыбарнае становішча правых, звесткі пра памер бюджэтнага дэфіцыту, які ў гэтым годзе складзе 20 мільярдаў даляраў ЗША. Нагадаем, што яшчэ тры гады таму столькі ж складаў бюджэт Расеі.

Апошняя акалічнасць азначае, што новаму ўраду давядзецца ісці на шэраг непапулярных мераў, звязаных са скарачэннем многіх сацыяльных праграмаў. Такая перспектыва для левых змусіла многіх назіральнікаў сказаць пра Польшчу, як пра выспу парадоксаў.

- Традыцыйна правыя ўрады робяць запасы і абмяжоўваюць сацыяльныя праграмы. А левыя, якія прыходзяць ім на змену, раздаюць грамадству зэканомленыя правымі сродкі. У нас жа атрымалася наадварот. Правыя патрацілі грошы, а левым давядзецца іх у грамадства атрымаць, - заявіў вядомы польскі публіцыст Лех Фаландыш адразу пасля таго, як сталі вядомы папярэднія вынікі выбараў.

Заўвага публіцыста сведчыць пра кансэнсус у палітычнай эліце адносна канцэпцыі эканамічнага развіцця краіны і пра пераемнасць улады. Нягледзячы на цяжкую спадчыну, левыя не маюць намеру прадпрымаць рэвалюцыйных захадаў, якія вядуць да змянення прыярытэтаў ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Яны разумеюць, што пачатыя правымі рэформы варта давесці да канца. Фактычна парламенцкія выбары ў Польшчы паказалі, што левыя сталі нармальнай сілай на польскай палітычнай сцэне і пазбыліся ў грамадскім успрыманні камуністычнай спадчыннасці.

Аднак «нармалізацыя» грамадскага ўспрымання левых спрыяла таму, што пратэстны электарат правёў у парламент калісьці палітычных маргіналаў. Радыкальны лідар «Самаабароны» Анджэй Лепер, што не набіраў у апытаннях грамадскай думкі болей як тры працэнты, нечакана атрымаў каля 10 працэнтаў падтрымкі, што дасць яму ў Сейме больш за 40 месцаў. Не менш адыёзная «Ліга польскіх сем'яў» таксама пераадолела 5-працэнтны бар'ер і зойме болей як 30 месцаў у парламенце.

Для Польшчы гэта - сур'ёзныя праблемы. Менавіта таму сацыёлаг Войцех Паўляк заявіў, што ўваходжанне ў Сейм радыкалаў - гэта галоўная падзея выбарчай кампаніі. А ягоная калега Ядвіга Станішкіс лічыць, што «Самаабарона» і «Ліга польскіх сем'яў» здольныя будуць заблакаваць уваходжанне Польшчы ў Еўрасаюз.

Гэтая небяспека абумоўленая тым, што SLD-UP, насуперак прагнозам, не хапіла галасоў выбаршчыкаў для заняцця ў Сейме большасці месцаў. Утварэнне ж урада меншасці азначала б аслабленне ўлады і ў перспектыве (ва ўмовах бюджэтнага дэфіцыту) ставіла б пад сумнеў магчымасць эфектыўнага развіцця краіны.

Усведамленне гэтага факту змусіла будучага прэм'ера Лешэка Мілера яшчэ да абвяшчэння афіцыйных выбараў распачаць кансультацыю пра структуру будучага парламента з лідарамі ўсіх партыяў, якія ў яго ўвайшлі. Гэта значыць, што SLD-UP зацікаўлена ў стварэнні кааліцыйнага ўрада з адной з партыяў, што рыхтуюцца стаць апазіцыйнымі.

Сярод найбольш верагодных альянсаў называецца саюз з сялянскай партыяй PSL або з лібераламі Анджэя Аляхоўскага з «Грамадзянскай платформы», якая заняла ў Сейме месца Уніі Свабоды.

Калі б ажыццявіўся апошні варыянт, дык Польшча канчаткова ўвайшла б у новую палітычную рэальнасць і пакінула за плячыма перыяд непрымірымасці дзеячаў з былой «Салідарнасці» і ПАРП (Польская Аб'ядная Рабочая Партыя). Асновай для стварэння падобнага альянса можа стаць практычна аднолькавае стаўленне SLD-UP і «Грамадзянскай платформы» да стратэгічнага для Польшчы ўваходжання ў Еўрасаюз.

**Анджэй Пісальнік**

**Прыход да ўлады ў Польшчы новай палітычнай сілы, верагодна, адаб'ецца на польска-беларускіх стасунках. Вынікі выбараў, іх магчымы ўплыў на польска-беларускія кантакты ПАГОНІ каментуюць лідары нацыянальных меншасцяў абедзвюх краінаў.**



__Яўген Вапа__, старшыня Беларускага саюза ў Польшчы:

*- Вынікі выбараў сведчаць пра ўзмацненне радыкальных настрояў у Польшчы. Партыі, якія кіравалі чатыры папярэднія гады, праваліліся. Выбаршчыкі цяпер ужо не звязаныя нейкай сацыяльна-палітычнай настальгіяй. Яны проста ацэньваюць тое, што было, і як кіруе ўлада. Выбаршчыкі гатовыя вельмі хутка змяніць свой погляд і прагаласаваць за каго іншага.*

*Паводле таго, што гаварыў старшыня SLD Лешэк Мілер, міністрам замежных спраў у Польшчы павінен стаць Уладзімір Цімашэвіч, амбасадар з Беласточчыны, які гэтым разам узяў звыш 70 працэнтаў галасоў. Здаецца, што Цімашэвічу праблемы польска-беларускіх стасункаў неабыякавыя. У інтэрв'ю польскім медыя ён заявіў, што трэба гаварыць пра нейкае эластычнае супрацоўніцтва паміж Польшчай і Рэспублікай Беларусь.*

*Маё прыватнае меркаванне - новы ўрад Польшчы не пойдзе не тое, каб адцягнуць увядзенне жорскага візавага рэжыму з Рэспублікай Беларусь. Усё будзе адбывацца з парадкамі, запланаванымі ў ЕС, асабліва пасля таго, як у Брусэлі міністры ўнутраных справаў краінаў ЕС выразна запатрабавалі ад Польшчы ўшчыльнення мяжы з Рэспублікай Беларусь. Ці зменіцца становішча беларусаў у Польшчы? Трэба пачакаць першых крокаў новай улады.*



__Тадэвуш Кручкоўскі__, старшыня грамадскага аб'яднання «Саюз палякаў на Беларусі»:

*- Гэта быў выбар палякаў, якія жывуць у сваёй краіне. Мы не мелі ўплыву на вынік выбараў. Не выключана, што ў польскай меншасці на Беларусі былі б іншыя выбарчыя прэферэнцыі. Лічу, што палякі Беларусі таксама мусяць браць удзел у польскіх выбарах, як палякі ў ЗША і Канадзе.*

*Цяжка сказаць, як будуць развівацца польска-беларускія стасункі. Лічу, што нейкія кантакты будуць. І напэўна, гэта будуць кантакты праз Маскву, Кіеў. Бо, як вядома, было спатканне Квасьнеўскага з Пуціным і Кучмам, у якім не ўдзельнічаў Лукашэнка. У адным з інтэрв'ю Аляксандр Квасьнеўскі адзначыў, што кантакты з Рэспублікай Беларусь павінны быць навязаныя.*

*Упэўнены, што ад новага польскага ўрада не залежыць, як хутка будзе ўведзены жорсткі візавы рэжым з Рэспублікай Беларусь. Гэта залежыць ад стасункаў Польшча - Еўрасаюз падчас прыняцця Польшчы ў Еўрасаюз.*

*Пакуль складана прагназаваць, ці палепшыцца сітуацыя польскай меншасці на Беларусі. У Польшчы нам увесь час дэкларуюць, што дапамога, якую атрымоўваем, не залежыць ад таго, якая партыя ва ўладзе ў Польшчы. Гэта афіцыйная пазіцыя. Як будзе на практыцы - пабачым.*

**Апытваў**
**Павал Мажэйка**

# Чытанні ў гонар Ажэшкі

**Учора ў памяшканні філалагічнага факультэта Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы распачала працу міжнародная канферэнцыя «Творчасць Элізы Ажэшкі і беларуская культура», якую арганізавала кафедра польскай філалогіі з нагоды 160-годдзя знанай пісьменніцы.**

У канферэнцыі прымаюць удзел вядомыя навукоўцы, прафесары Віктар Хораў і Алена Цыбенка з Масквы, Марыя Лізіс і Марыя Рахвалова з Кракава, Ванда Рэнік з Варшавы, Юзеф Бахуж з Гданьска, Антоні Хайнацкі з Седліцаў, а таксама выкладчыкі БДУ і Гарадзенскага дзяржуніверсітэта.

Сёння удзельнікі канферэнцыі наведалі памятныя мясціны - надмагілле апісаных у рамане Элізы Ажэшкі «Над Нёманам» Яна і Цыцыліі ў Багатырэвічах. А ў мемарыяльным пакоі, што сёлета адкрыўся ў доміку пісьменніцы ў Гродне, прайшлі літаратурныя чытанні. Арганізатары плануюць выдаць матэрыялы канферэнцыі асобнай кнігай.

**Адам Гонар**

# І такое было пры тых Саветах

**У савецкім і дзяржаўным друку постсавецкага перыяду шмат было публікацыяў аб трыумфальным шэсці новай улады па тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1939 годзе. Не будзем аспрэчваць: што было, тое было. Але пра той час нельга гаварыць аднязначна. Не ўсюды новыя валадары верай і праўдай служылі працоўным. Вось колькі фактаў з тагачаснага жыцця ў Слонімскім павеце, пра якія паведаміў наркому ўнутраных справаў Цанаву начальнік адпаведнага ўпраўлення НКВД Баранавіцкай вобласці палкоўнік А.Місюроў. Яго службовы ліст у сталіцу прысвечаны ажыццяўленню палітыкі партыі ды ўрада ва ўзгаданым павеце і пазначаны 20 снежня 1939 года.**

У дакуменце адзначаецца, што кіраўніцтва ў асобе сакратара павятовага камітэта партыі Новікава і старшыні павятовага выканаўчага камітэта Колатава допускае хібы ў рабоце на сяле. Пад маркай нацыяналізацыі памешчыцкай зямлі на месцах раскулачвалі сераднякоў. Часам канфіскоўвалі ўсю маёмасць аж да хатняй птушкі. Адбывалася такое адразу пасля вызвалення, увосень 1939 года. У вёсцы Клепачы Міжэвіцкай гміны пацярпелі шэсць гаспадарак, якія налічвалі да 13 гектараў зямлі. Іх канфіскавалі з маёмасцю. Частку жывёлы аддалі беднякам, якія адразу ж пусцілі яе на мяса. У гміне Чэмяры падобны лёс напаткаў чатыры гаспадаркі, хоць яны не падлягалі такім жорсткім мерам. Часовы камітэт забраў усю іх маёмасць, у тым ліку і курэй. Падобнае тварылася і ў іншых гмінах павету. У адказ сяляне пачалі масавы продаж жывёлы, сталі забіваць яе на мяса, хоць у гэтым не было асаблівай патрэбы.

А як ацэньвалі такое свавольства і супрацьзаконныя дзеянні «бацькі» павету? Як сказана ў сакрэтным данясенні, на нарадзе ўпаўнаважаных Новікаў і Колатаў аб перакосах прамаўчалі. Далей гаворыцца пра іншыя амаральныя факты, што Новікаў п'янствуе і вядзе сябе непрыстойна. Ноччу з 6-га на 7-е лістапада ў будынку павятовага камітэта партыі ён прымушаў дзяжурную камсамолку Котаву (у 2 гадзіны святочнай ужо кастрычніцкай ночы) да палавых зносінаў. Пра гэта яна заявіла ў міліцыю. У сваю чаргу абласное ўпраўленне НКВД інфармавала пра «ЧП» абласны камітэт партыі. Пастаўлена было пытанне аб адкліканні Новікава са Слоніма.

А вось якая інфармацыя для роздуму змяшчаецца ў рапарце тагачаснага наркома ўнутраных справаў БССР Цанавы першаму сакратару ЦК КП(б)Б П.Панамарэнку. Дакумент датаваны 19 лістапада 1939 года і мае N57, прысвечаны бяздзейнасці Часовай управы Ашмянскага павету (старшыня Аксёнаў). У прыватнасці, тут апавядаецца пра «кіпучую» дзейнасць упаўнаважанага Левіна ў мястэчку Гальшаны. Ён звязаўся са спекулятыўным элементам, ахвотна браў хабар-падарункі, п'янстваваў. Прадстаўнік павету вярнуў адабраныя ў гандляроў тавары, адмяніў іншыя пакаранні, а старшыню гміннага камітэта, дэпутата Народнага сходу Заходняй Беларусі Казлоўскага пры гандлярах і сябрах рабочай гвардыі назваў авантурнікам і самазванцам.

Далей Левін абвінавачваецца вось за што. Працуючы ў гміне, ён быў толькі ў дзвюх вёсках. Ноччу ж меў звычай адкрываць страляніну, каб нагнаць страху на «тэрарыстаў» і «дыверсантаў». Узброіўся аж трыма пісталетамі. Каля дзвярэй свайго кабінета распарадзіўся паставіць трох паставых з ліку рабочай гвардыі.

Вось якія людзі усталёўвалі часам у нашым краі ўладу Саветаў напрыканцы 1939 года.

**Сяргей Баравы**

Артыкул падрыхтаваны на аснове кнігі «Заходняя Беларусь. 17.IX.1939 - 22.VI.1941». Том першы, Варшава.

# З Шэкспірам можна хоць у Маскву, хоць у Варшаву

**Гарадзенскі абласны тэатр лялек ахвяраваў удзелам у тэатральным фестывалі «Белая Вежа» і ў гэты ж самы час падстаўляў сваё мастацтва ў Расеі. Спачатку - у Маскве на Міжнародным фестывалі, прысвечаным 100-годдзю Сяргея Абразцова і 70-годдзю яго знакамітага тэатра, а потым - у Разані, на фестывалі «Разанскія агледзіны». Гэтыя паездкі адбыліся шмат у чым дзякуючы сённяшняму галоўнаму рэжысёру тэатра Алегу Жугжду.**

**Алег прыехаў з Магілёўскага тэатра ў пачатку мінулага сезону. На гарадзенскай сцэне адразу павеяла свежым ветрам. За адзін сезон рэпертуар Театра ляек папоўніўся пяццю спектаклямі ў ягонай пастаноўцы. Калектыў паспеў з'ездзіць на фестывалі ў Торунь, Беласток, Ужгарад, Алітус. А якія свежыя ўражанні ад Маскоўскага і Разанскага?**

- У Маскве нам давялося літаральна ў першы дзень, гэта значыць, 14 верасня. Неразбярыха была жахлівая. Мы прывезлі два спектаклі. «Сон у летнюю ноч» (прыгожы і вясёлы спектакль - заўвага Н.П.) паказалі позна ўвечары. Вельмі баяліся, што публіцы ўжо ўсё роўна, што адбываецца на сцэне. Але ж не. Завялі-такі ды рассмяшылі. Потым да нас падыходзілі акторы-масквічы, рэжысёры. Вельмі хвалілі. Шмат добрых словаў на наш адрас сказалі вядомыя ў сусветным лялечным асяроддзі палякі Хенрык Юркоўскі і Марэк Вашкель.

*- А што Вам больш за ўсё спадабалася ў іншых?*

- На жаль, нам вельмі мала давялося ўбачыць у Маскве, але не магу не сказаць пра індыйскі тэатр з Раджастана. Марыянеткі, але нітачкі не на крыжавіне, як у нас, а ўсё ў пальцах. Лялькі такія жвавыя, так танцуюць! Акторы - віртуозы. Вельмі прафесійнае акторскае майстэрства прадэманстравалі лялечнікі з Беластока. Увогуле, мне бліжэй такія фестывалі, які быў у Разані. Там мы былі цэлы тыдзень. Сустракалі сваіх старых сяброў, нават аднакурснікаў. Фестывалі, ва ўсякім выпадку лялечных тэатраў, зазвычай лепей праходзяць у невялікіх гарадах. У іх не так развіты шоу-бізнес, які ў сталіцах пераважае над камерным і арганічным мастацтвам.

*- А гледачы таксама розныя?*

- Маскву парадкам раз'ела субкультура. Дзеці арыентаваны на шоу кшталту "Тэлепузікаў" (Омскі тэатр праваліўся са сваім спектаклем, які раней на адным з фестываляў узяў Гран-пры. Нельга сказаць, што ён быў вельмі складаным, але нейкая задума ў ім была. Матулі выводзілі дзяцей з залы і абураліся.

*- Ці было чаму пазайздросціць?*

- Бадай, прафесійнаму майстэрству актораў з Беластока і Архангельска. Прычым апошнія прывезлі вельмі простую і вядомую казку «Маша і Мядзведзь» для дзяцей. Але акторы так ігралі, што спектакль і дарослым было цікава глядзець.

*- Алег, чаму Вашыя ўлюбёныя лялькі - марыянеткі?*

- Гэта самая незалежная лялька.

**Ніна Палуцкая**

P.S.: Днямі гарадзенскія лялечнікі атрымалі запрашэнне ад сваіх польскіх калег з варшаўскага тэатра «Гулівер», каб паказаць іншы шэкспіраўскі спектакль - «Трагедыю аб Макбеце».

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# Грын-карта - шанец выбрацца з балота

**30 верасня ў амбасадах і консульствах ЗША завяршаецца выдача візаў для ўдзелу ў латарэі «DV-2003», якая дае права на эміграцыю ў ЗША. У гэтым годзе, у параўнанні з мінулым, адбыліся некаторыя змены пры падачы анкетаў і ў правілах іх афармлення. Але пра гэта чытайце ніжэй. Паколькі інфармацыі вельмі шмат, мы падаем самую істотную. Падрабязней пра гэта можна даведацца на сайце амбасады ЗША ў Беларусі (http: //www.usembassy.minsk.by).**

## Што такое «DV-2003»

Праграма «DV-2003» прадугледжвае прадастаўленне статусу сталага жыхара асобам, якія адпавядаюць простым, але строгім крытэрыям адбору. Заяўнікі, ахвотныя атрымаць візы «DV-2003», адбіраюцца шляхам адвольнага лёсавання, праводзімага з дапамогай кампутара. Візы, аднак, размяркоўваюцца паміж шасцю геаграфічнымі рэгіёнамі, прычым у рэгіёны з нізкім узроўнем іміграцыі ў ЗША будзе накіроўвацца болей візаў. У краіны, з якіх за апошнія пяць гадоў у ЗША прыбыло больш як 50 000 імігрантаў, візы накіроўвацца не будуць. Ніводная краіна не можа атрымаць больш як сем працэнтаў візаў «DV», выдаваемых на працягу нейкага аднаго года.

Заявы аб удзеле ў латарэі візаў «DV-2003» павінны быць атрыманыя адным з консульскіх цэнтраў у штаце Кентукі, паштовыя адрасы якіх пададзеныя ніжэй, з **12.00 у панядзелак першага кастрычніка 2001 года да 12.00 у сераду 31 кастрычніка 2001 года.** Заявы, атрыманыя да пачатку альбо па сканчэнні гэтага перыяду, не будуць дапушчаныя да ўдзелу ў латарэі незалежна ад даты на паштовым штэмпелі. Апроч таго, да ўдзелу ў латарэі не будуць дапушчаныя заявы, адпраўленыя па любому іншаму адрасу, адрознаму ад адрасоў консульскіх цэнтраў у штаце Кентукі, указаных ніжэй.

## Адукацыя ці кваліфікацыя

**Гэта галоўная ўмова для ўдзельнікаў латарэі.** Для таго, каб заяўнік (яго сям'я), калі прыедзе на сталае месца жыхарства, мог (магла) сябе забяспечыць.

Каб удзельнічаць у латарэі, заяўнікі павінны мець атэстат сярэдняй школы ці яе эквівалента (у Злучаных Штатах пад гэтым разумеецца паспяховае заканчэнне 12-гадовага курсу навучання ў пачатковай і сярэдняй школе), альбо два гады працоўнага стажу на працягу папярэдніх пяці гадоў. Прычым размова ідзе аб працоўнай дзейнасці, для выканання якой патрабуецца па меншай меры два гады навучання ці стажу. Для вызначэння адпаведнасці патрабаванням адносна працоўнага стажу будзе выкарыстана база дадзеных Міністэрства працы ЗША O*Net Online: www.onetcenter.org.

## Анкета-заява

Пры запаўненні анкеты-заявы не патрабуецца нейкі асобы фармат. Проста вазьміце чысты аркуш паперы і, выкарыстоўваючы ангельскі (лацінскі) алфавіт, запоўніце анкету-заяву на машынцы ці разборлівымі друкаванымі літарамі, напісанымі ад рукі наступным чынам.

**1. Поўнае імя** (імя ды імя па бацьку) і прозвішча, прычым прозвішча варта падкрэсліць:

Ivanouski Igor Ivanovich

**2. Дата і месца нараджэння.**

Дата: дзень, месяц, год:

15 November 1961

**Месца:** горад/сяло, раён, вобласць/правінцыя, краіна:

Grodno, Belarus

Назва краіны павінна адпавядаць сённяшняму найменню месца, дзе нарадзіўся заяўнік.

**3. Краіна, ураджэнцам якой з'яўляецца заяўнік**, калі яна не супадае з краінай яго нараджэння. Калі заяўнік сцвярджае, што ён з'яўляецца ўраджэнцам іншай краіны, чым краіна яго/яе нараджэння, гэта павінна быць зразумела ўказана ў анкеце-заяве. Гэтая інфармацыя павінна супадаць з інфармацыяй, змешчанай у верхнім левым куце канверта з анкетай-заявай. Калі заяўнік сцвярджае, што з'яўляецца ўраджэнцам дадзенай краіны дзякуючы жонцы/мужу ці маці/бацьку, просьба ўключыць гэтую інфармацыю ў анкету-заяву.

**4. Прозвішча ды імя** (імя, імя па бацьку), **дата і месца нараджэння** мужа/жонкі ды ўсіх уласных (неўсыноўленых) дзяцей, а таксама ўсіх дзяцей, усыноўленых/удачароных у законным парадку, пасынкаў і падчырыцаў заяўніка, які не жанатыя/не замужам, і якім не споўнілася 21 год, нават калі вы больш не ў законным шлюбе з бацькам дзіцяці і нават калі дзіця зараз не пражывае з вамі і/ці не будзе іміграваць разам з вамі. Звярніце ўвагу на тое, што дзеці, якім ужо споўнілася 21 год, і жанатыя/замужнія дзеці не падпадаюць пад крытэрыі адбору для візы «DV». У выпадку непрадастаўлення поўнага спісу ўсіх дзяцей, Ваша анкета-заява не будзе прынята да разгляду.

**5. Поўны паштовы адрас.** Гэтая інфармацыя павінна быць зразумелай і поўнай, бо любыя пасланні і паведамленні будуць накіроўвацца на гэты адрас. Нумар тэлефона ўказваць неабавязкова. Аднак лепей гэта зрабіць.

**6. Фотаздымак.** Трэба прыкласці нядаўнія фотаздымкі заяўніка, яго/яе жонкі/мужа і ўсіх дзяцей. Прозвішча ды імя заяўніка павінны быць напісаныя на адваротным баку фота друкаванымі літарамі. Заява будзе скасавана, калі патрабуемыя фотаздымкі не будуць дасланыя.

**7. Подпіс.** Заяўнік павінен асабіста падпісаць анкету сваім звычайным подпісам, такім жа, як у пашпарце заяўніка, альбо ў іншых афіцыйных дакументах. Адсутнасць у анкеце-заяве асабістага подпісу абумовіць дыскваліфікацыю заяўніка.

## Адпраўка анкеты-заявы па пошце

Для Еўропы (у тым ліку Беларусь і ўсе былыя рэспублікі СССР):
**DV-2003 Program**
**Kentucky Consular Center**
**3003 Visa Crest**
**Migrate, KY 41903-3000, U.S.A.**

Адпраўце анкету-заяву звычайнай ці авіяпоштай. Анкеты-заявы, дасланыя экспрэс- альбо тэрміновай поштай, адпраўленыя па факсу, уручаныя асабіста ці праз пасыльнага або адпраўленыя любым іншым спосабам, разглядацца не будуць.

**Даўжыня канверта** павінна быць 6-10 дзюймаў (15-25 см), а шырыня - 3,5-4,5 дзюйма (9-11 см). Паштоўкі ці канверты, якія знаходзяцца ўнутры канвертаў экспрэс-пошты ці іншых канвертаў буйнога памеру, прымацоўца не будуць. У верхнім левым куце канверта заяўнік павінен указаць краіну, ураджэнцам якой ён з'яўляецца, а потым прозвішча ды імя (імя па бацьку) заяўніка і поўны паштовы адрас. Нават калі размова ідзе пра адну і тую ж краіну, заяўнік павінен указаць як краіну свайго нараджэння, так і краіну, да якой належыць гэты адрас. Адсутнасць гэтай інфармацыі абумовіць дыскваліфікацыю анкеты-заявы.

## Парадак падачы анкеты-заявы

Усе анкеты-заявы, дасланыя заяўнікам, будуць скасаваныя, калі ад імя заяўніка будзе пададзена **БОЛЬШ ЯК АДНА ЗАЯВА**, незалежна таго, хто падаў анкету-заяву.

Заява не будзе разглядацца, калі заяўнік **НЕ ПАСТАВІЦЬ НА АНКЕЦЕ-ЗАЯВЕ СВОЙ АСАБІСТЫ ПОДПІС.** Подпіс павінен быць звычайным, з выкарыстаннем алфавіта сваёй роднай мовы, як ён выглядае ў пашпарце заяўніка альбо іншых афіцыйных дакументах. Не будзе прынята да разгляду анкета-заява, падпісаная ініцыяламі або друкаванымі літарамі. Калі заяўнік аддае перавагу выкарыстоўваць у сваім подпісу літары лацінскага алфавіта, які не з'яўляецца алфавітам яго/яе роднай мовы, ён/яна павінен/павінна таксама падпісацца, выкарыстоўваючы алфавіт сваёй роднай мовы.

Анкета-заява не будзе разглядацца, калі заяўнік не прымацуе да яе ўсе патрабуемыя фотаздымкі. Нядаўнія фотаздымкі заяўніка, яго/яе жонкі/мужа і кожнага дзіцяці, уключаючы ўсіх уласных (неўсыноўленых) дзяцей, а таксама фота ўсіх дзяцей, усыноўленых/удачароных у законным парадку, пасынкаў і падчарыцаў, нават калі дзеці больш не пражываюць з заяўнікам, павінны быць прымацаваныя да заявы. Імя і дату нараджэння кожнага члена сям'і неабходна напісаць на адвароце фотаздымкаў друкаванымі літарамі. Групавыя ці сямейныя фотаздымкі прымацца не будуць. На кожнага члена сям'і павінен быць прадстаўлены асобны фотаздымак. Фотаздымкі трэба прымацаваць да анкеты-заявы клейкай стужкай (скотчам), а не пры дапамозе канцылярскага сшывальніка. Калі на пярэднім боку заявы не хапае месца, фотаздымкі могуць быць прымацаваныя да адваротнага боку.

Заява не будзе разглядацца, калі фотаздымкі не будуць адпавядаць наступным патрабаванням:

**ПАМЕР:** 2 дзюймы (50 мм) у даўжыню і шырыню, імя заяўніка, мужа/жонкі ды дзіцяці, а таксама даты іх нараджэння, напісаныя на адвароце фота друкаванымі літарамі.

Заяўнік, муж/жонка і дзіця павінны глядзець проста ў фотакамеру; галава фотаграфуемага не павінна быць нахілена ўбок або схілена долу, падбародак не павінен быць узняты ўверх. Неабходна, каб галава фатаграфуемага займала прыблізна 50 працэнтаў плошчы фотаздымка.

Фотаздымкі павінны быць выкананыя на светлым нейтральным фоне. Фотаздымкі, зробленыя на вельмі цёмным фоне альбо на фоне паверхні з дэкаратыўным або іншым узорам, а таксама на фоне, перагружаным дэталямі, прымацца не будуць.

Фотаздымкі, на якіх выява твару фатаграфуемага не сфакусіравана, таксама прымацца не будуць. Фотаздымкі, на якіх фатаграфуемы выяўлены ў галаўным уборы альбо ў цёмных акулярах, ці ягоны твар нейкім чынам зацемнены, прымацца не будуць.

Фотаздымкі могуць быць каляровымі альбо чорна-белвымі.

**Узор канверта** 15-25 см

| | |
|---|---|
| Belarus<br>Igor Ivanouski<br>Kletskova 1, 123<br>Grodno, Belarus 230000 | |
| | DV-2003 Program<br>Kentucky Consular Center<br>3003 Visa Crest<br>Migrate, KY 41903-3000, U.S.A. |

9-11 см

**Калі ў Вас узніклі нейкія пытанні адносна вышэйпададзенай інфармацыі, больш падрабязна Вы можаце пазнаёміцца з ёй на сайце амбасады ЗША ў Беларусі: http: //www.usembassy.minsk.by, на аснове якой падрыхтавана дадзеная публікацыя.**

**П.І.І. Цалкам** ________________
Прозвішча Імя Імя па бацьку

**Дата нараджэння** ________________
Дзень, месяц, год

**Месца нараджэння** ________________
Горад, раён/акруга/правінцыя, краіна

**Краіна, ураджэнцам якой з'яўляецца заяўнік, калі яна не супадае з краінай яго нараджэння**
________________

**Прозвішча ды імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння мужа/жонкі (калі ёсць)**
________________
П.І.І. Дата нараджэння (дзень, месяц, год) Месца нараджэння

**Прозвішча ды імя, імя па бацьку, дата і месца нараджэння дзяцей заяўніка (калі такія ёсць)**
________________
П.І.І. Дата нараджэння (дзень, месяц, год) Месца нараджэння
________________
П.І.І. Дата нараджэння (дзень, месяц, год) Месца нараджэння

**Поўны паштовы адрас**
________________
Вуліца, N дома, кватэры
________________
Горад Раён, вобласць Краіна
________________
Паштовы індэкс Тэлефон E-mail

**Подпіс** ________________

**Фота** 5x5 см
На адвароце фотаздымка напісаць прозвішча, імя ды імя па бацьку друкаванымі літарамі. Прозвішча падкрэсліць

Прымацуйце фотаздымак кавалачкам скотчу так, каб яго можна было адгарнуць і паглядзець інфармацыю на адваротным боку фота. Калі месца не хапае на пярэднім боку заявы, - можаце смела мацаваць на яе адваротны бок

**Узор анкеты-заявы на ўдзел у латарэі візаў «DV-2003»**

# Адбор пераможцы

Асобы, якія выйграюць у латарэі, будуць вызначаныя на падставе адвольнага кампутарнага адбору з ліку ўсіх анкетаў-заяваў, што адпавядаюць прад'яўленым патрабаванням. Асобам, выбраным такім чынам, паміж траўнем і ліпенем 2002 года будзе накіравана па пошце паведамленне адносна адбору і далейшыя інструкцыі, у тым ліку інфармацыя аб уплаце збораў, звязаных з іміграцыяй у ЗША. Асобам, чые анкеты-заявы не былі выбраныя кампутарам, паведамленні накіроўвацца не будуць. У амбасадаў і консульстваў ЗША не будзе магчымасці прадастаўляць спіс заяўнікаў, выбраных у выніку латарэі. Муж і жонка, а таксама неанежаныя/незамужнія дзеці такіх заяўнікаў (ва ўзросце да 21 года) таксама могуць падаваць анкеты-заявы з просьбай аб выдачы візаў, што дадуць ім магчымасць суправаджаць галоўнага заяўніка альбо ехаць разам з ім з мэтаю далейшага сумеснага пражывання. Візы «DV-2003» будуць выдавацца з першага кастрычніка 2002 года па 30 верасня 2003 года.

Каб атрымаць візы, заяўнікі павінны адпавядаць усім патрабаванням, прад'яўленым да іх згодна з заканадаўствам ЗША.

Разгляд анкетаў-заяваў і выдача візаў кштальту «DV» заяўнікам, выбраным у выніку латарэі, ды членам іх сем'яў, што маюць права на атрыманне такіх візаў, павінны быць завершаныя да 30 верасня 2003 года. Пасля гэтай даты ні пры якіх абставінах візы «DV» выдавацца не будуць; ніякія папраўкі ў дакументацыю ўносіцца не будуць; члены сем'яў заяўнікаў таксама пазбаўляюцца права на атрыманне візаў «DV», што дазваляюць ім ехаць разам з заяўнікам з мэтай далейшага сумеснага пражывання ў ЗША.

**Увага!** Каб прыняць удзел у праграме «DV-2003», не патрабуецца ніякіх першапачатковых унёскаў.

Пры правядзенні праграмы «DV» урад ЗША **не карыстаецца паслугамі пабочных кансультантаў або прыватных паштовых службаў.** Любы пасярэднік і ўсякі, хто прапануе сваю дапамогу ў падрыхтоўцы анкеты-заявы «DV», **не мае на тое паўнамоцтваў і згоды з боку ўрада ЗША.** Пытанне наконт выкарыстання пабочнага пасярэдніка альбо адносна атрымання дапамогі ў падрыхтоўцы анкеты-заявы для «DV-2003» вырашаецца выключна заяўнікам.

Анкеты-заявы, што адпавядаюць патрабаванням, атрыманыя непасрэдна ад заяўнікаў і праз пасярэднікаў, маюць такую ж верагоднасць быць выбранымі кампутарам у Кансульскім цэнтры штата Кентукі, што і заявы, атрыманыя цераз аплочанага пасярэдніка, які запоўніў анкету для заяўніка. Своечасовая адпраўка анкетаў-заяваў ці іх адпраўка з нейкай пэўнай мясцовасці не прывядзе да атрымання нейкіх пераваг. Усе анкеты-заявы, атрыманыя на працягу ўстаноўленага тэрміну, будуць мець роўныя шанцы ў адвольнай кампутарнай латэрэі для дадзенага рэгіёну. Аднак, асоба, якая накіравала больш як адну заяву, не будзе дапушчана да рэгістрацыі.

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# РЭКЛАМА Тэлефоны: (0152) 72-29-96, 72-37-14




## ПРАДАЮ

### НЕРУХОМУЮ МАЁМАСЦЬ

Дом у маляўнічай мясціне на беразе возера Бершты, ёсць 40 сотак зямлі. Тэл. 31-94-21.

4-пакаёвы катэдж (112 кв.м) у 2 км ад г.Слоніма, з зямельным надзелам (альбо мяняю на гарадскі), ёсць прыродны газ, тэлефон, гараж. Побач - возера. Тэл. у Свіслачы: (8-213) 2-45-62.

Жылы дом з гаспадарчымі пабудовамі ды прысядзібным участкам (20 сотак) у прыгарадзе Свіслачы. Тэл. 2-27-43 (увечары).

Недабудаваную цагляную дачу ў раёне турбазы «Нёман», ёсць вада, святло, будматэрыялы. Тэрмінова. Нядорага. Тэл. 5-49-89.

Прыватызаваную блочную дачу з мансардай і добрым ураджаем (кошт - 989 у.а.), танна - кніжныя секцыі, стол-кнігу, жаночае дэмісезоннае паліто, жаночыя туфлі (36 памеру). Тэл. 44-45-16.

Новы 5-актаўны прагramуемы сінтэзатар «Yamaha PSR-270» з Midi-сістэмай: 100 рытмаў, 238 мелодыяў, 90 функцыяў. Кошт - 300 у.а. Магчымы варыянты. Тэл. 93-91-43.

### ТРАНСПАРТНЫЯ СРОДКІ, ЗАПЧАСТКІ

«Ford Escort» 1.4, бензін, 1987 г.вып. (па запчастках), 5-дзверны, 5-ступенчаты. Тэл. у Мастах: (8-215) 2-73-71 (пасля 17.00).

«Renault-21» 1.7Б, 1990 г.вып. (на запчасткі). Тэл. у Слоніме: (8-029) 642-60-01.

«ГАЗ-51» (газ-бензін), у добрым стане. Кошт - 500 у.а. Тэл. у Мастах: (8-215) 2-12-74.

«Масквіч Комбі» на запчасткі. Тэл. 5-38-44.

«Масквіч-412» на запчасткі. Тэл. 5-93-67.

Запчасткі (б/у) да а/м «Mazda-626» 85-87 г.вып., рухавік да а/м «Toyota-Korola» 1.4б 84 г.вып. Тэл. 33-82-74.

Матацыклы «ІЖ-10-4к», «Ява-250-6в» (можна на запчасткі), новы воз. Тэл. (8-214) 3-36-61.

Трактар «Т-40» у добрым стане. Тэл. у Шчучыне: 2-48-08.

### ІНШАЕ

Акустычную сістэму «Клівер» 50АС-201. Кошт 20 у.а. Тэл. 5-76-65. 31-23-27 (пасля 17.00).

Новую падвесную паліцу для кніг. Тэл. 2-23-07.

Дзіцячы спартовы куточак (б/у). Нядорага. Тэл. 72-73-97.

Драўляныя вонкавыя і ўнутраныя дзверы (кошт - 40 у.а.), каляровы тэлевізар «Гарызонт-64» (б/у). Тэл. 72-90-96, 33-76-71.

Гульнёвую прыстаўку «SEGA» 16 bit (кошт - 20 у.а.), б/у, і 12 картрыджаў (па 3.500 рублёў). Тэл.прац. 72-37-14, 72-29-96 (з 10.00 да 18.00, акрамя серады і выхадных, запрасіць Святлану), тэл.хатні 75-44-70 (пасля 19.00).

Прыхожую (б/у) у выдатным стане. Тэл. 5-18-55 (пасля 19.00).

Мяккую мэблю, два пуфікі, тумбачку пад тэлевізар. Усё новае. Тэл.

Швачную машыну «Орша», «Singer», аверлок, ніткі, дыван новы. Тэл. 44-66-20.

Новую швачную машыну «Чайка», піяніна «Беларусь» (б/у, чорнага колеру), паўтарачны ложак (б/у). Тэл. 33-73-90.

Калекцыю савецкіх і расейскіх манетаў, спартовыя гантэлі, тры плафоны для электрычных лямпачак у санвузел, лекавы пояс ад астэахандрозу, макулатуру. Тэл. 6-69-65 (пасля 18.00).

Фотаапарат «Зеніт» ЕТ, «Элікон», залаты ланцужок. Тэл. 31-08-95.

Формы для вырабу тратуарнай пліткі «пол-брук» (800 адзінак). Танна. Тэл. у Беластоку: (4885) 743-46-57.

Металічную бочку ёмістасцю 330 метраў. Брызентавы чахол на аўтамабіль. Тэл. 31-98-61.

Новы электрабаян «Тапаз». Танна. Тэл. у Ваўкавыску: 7-03-42.

Кнігі ды часопісы ў выдатным стане з хатняй бібліятэкі. Вельмі танна. Пішыце на адрас: 210021, г.Віцебск, вул.Цітова, 121-15.

Тканіну на паліто і плашчы; мужчынскія касцюмы (п.48-50), мужчынскія плашчы. Тэл. 33-79-95.

Ванну (б/у), газавую пліту, пральную машыну (б/у). Тэл. 31-79-49, 33-12-92.

Чыгунную ванну блакітнага колеру (даўжынёю 150 см) у выдатным стане (кошт - 30 у.а.), чыгунную кухонную мыйку, уваходныя драўляныя дзверы. Усё б/у. Танна. Тэл. 72-70-60.

Байдарку, фотаапарат «Зеніт», свідравальны станок, электратачыла. Тэл. 2-38-20.

Чэкі «Жыллё» на суму 1920 рублёў. Тэл. у Мастах: 3-28-91 (з 9.00 да 17.00).

Паляўнічае ружжо і прыналежнасці да яго. Тэл. у Ваўкавыску: 2-29-23.

Чорна-белы тэлевізар «Вясна-308» (б/у), рассоўны кухонны стол; 2-створкавую паліраваную шафу карычневага колеру (б/у). Усё ў добрым стане. Тэл. 6-69-65 (у любы час).

Новыя вагі для немаўлятаў, абліцовачную плітку (15x15), 1-спальны і 1,5-спальны сеннікі з наматрацнікамі, 1,5-спальную тахту, дзіцячы ложак.

## КУПЛЮ

Маразільную камеру (б/у), халадзільнік (б/у), крэсла-ложак. Нядорага. Тэл. 2-45-65.

Новы ватны сяннік на 1,5-спальны ложак. Тэрмінова. Тэл. 6-69-65 (пасля 17.00).

Жыллё ў Гродне коштам да 4000 у.а. Тэл. 72-37-14, (8-214) 3-61-05.

Пэйджар і мабільны тэлефон. Танна. Тэл. 39-98-55 (з 19.00 да 21.00, запрасіць Дзяніса).

Кампутар «Duron» альбо 15-дзюймовы манітор. Тэл.у Шчучыне: (8-214) 2-52-44.

Лабавое шкло да а/м «AUDI-80» 85 г.вып. Тэл. 76-33-17.

Дызельнае паліва. Тэл. 5-38-12.

Гантэлі, штангу. Тэл. 5-50-55 (аб.1377).

Антыкварыят, старыя манеты, узнагароды, гадзіннікі. Тэл. 72-02-26.

## МЯНЯЮ

1-пакаёвую кватэру на 2-ім паверсе ў Віцебску на такую ж у Паставах альбо прадаю. Тэл. у Паставах: 2-34-59.

2-пакаёвую прыватызаваную з усімі выгодамі кватэру ў г.Орша на гарадзенскую альбо ваўкавыскую. Тэл. у Оршы: 2-71-74.

## ПАСЛУГІ

Рамонт каляровых тэлевізараў. Устаноўка ПАЛ, ДК, тэлетэксту. Ліц.N1243, выдадзеная Міністэрствам прамысловасці РБ да 2004 года. Тэл. 31-37-05.

Абследаванне і лячэнне хранічных захворванняў па методыцы Р.Фоля. Ліц.МЗ РБ N224 да 30.12.2001 года. Тэл. (8-017) 258-88-14.

Распілоўка лесу. Піламатэрыялы пад заказ. Ліц. N003039, выдадзеная Міністэрствам лясной гаспадаркі да 11.05.2005 года. Тэл. 6-63-85; 5-89-04; 2-55-94.

Рэпетытарства, кантрольныя работы па матэматыцы і фізіцы. Тэл. 44-26-83.

Ангельская мова: рэпетытарства, пераклады. Тэл. 74-32-77.

Усё па французскай мове. Тэл. 71-14-56.

Выконваю пераклады з рускай на польскую і з польскай на рускую мову. Тэл. 44-66-20.

Дапамагу па біялогіі ды хіміі. Тэл. 78-16-81.

Рэпетытарства (школьны курс), акрамя моваў. Тэл. 72-00-23 (пасля 17.00 - вахцёр), 44-34-79 (запрасіць Наталлю).

Выконваю пераклады з рускай на польскую і з польскай на рускую мову. Тэл. 44-66-20.

Рамонт кампутараў, манітораў, прынтараў. Безнаяўны разлік. Ліц. N2004, выдадзеная Міністэрствам прамысловасці РБ да 2006. Тэл. 72-16-47.

Рэпетытарства (школьны курс), акрамя моваў. Тэл. 72-00-23 пасля 17.00 (вахцёр) і 44-34-79 (запрасіць Наталлю).

Гранітныя помнікі. Разнастайныя формы. Мастацкае аздабленне. Чыгунныя літыя крыжы. Танна. Тэл. 6-66-64, 6-92-66.

## РОЗНАЕ

Здыму 1-пакаёвую кватэру на першым паверсе пад кабінет. Нядорага. Тэл. 39-96-76 (да 9.00 і з 21.00).

Здыму кватэру з тэлефонам не даражэй за 50 у.а. на працяглы тэрмін. Тэл. 6-67-65.

Новы выбар на «Выставе аўдыё-відэа-кнігапрадукцыі», што знаходзіцца ў Гродне па вуліцы К.Маркса,11 (другі паверх). Час працы: кожныя панядзелак і сераду з 17.00 да 20.00.

Грамадскае аб'яднанне аховы жывёлаў «Дабрыня» просіць аказаць дабрачынную дапамогу для ўтрымання бяздомных жывёлаў. Наш разліковы рахунак у Гарадзенскім ААТ «Белпрамбудбанк» - 301501629001, МРО 335 (код банка).

Прашу дапамагчы мне і маім дзецям. Наш адрас: 211910, Віцебская вобласць, пасёлак Шаркаўшчына, вул.Горкага, 4-13.

Маю патрэбу ў дапамозе ў хатніх справах за бясплатнае пражыванне ў асобным пакоі. Тэл. 2-23-07.

Усе, хто мае інфармацыю пра эскадрылью «Нармандыя-Нёман», просім адгукнуцца на нумар тэл. 72-65-65.

Просьба да ахвотных перапісаць CD «Я нарадзіўся тут... Фотаальбом», CDZet «З Новым годам» - тэлефануйце на нумар 31-20-84.

Шукаю партнёраў у бізнесе. Тэл. 33-92-13 (з 8.00 да 10.00).

Збіраю любую інфармацыю пра антыкварыят. Тэл. 31-25-35 (аб.12196).

Дапамагу ў выкананні тынкавальных работаў. Тэл. у Ваўкавыску 4-33-20 (запрасіць Пятра).

Шукаю працу тынкоўшчыка на прадпрыемстве. Тэл. 31-03-49.

Здыму 1-, 2-пакаёвую кватэру. Тэл. (8-214) 3-61-05 (пасля 19.00), тэл. 72-37-14 (запрасіць Алесю).

Маю патрэбу ў ацэнцы (з мэтай продажу) нямецкага піяніна «Sponnagel» (G.Richter. Frankfurt a/o) 1900 г. Тэл.прац. 72-37-14, 72-29-96 (з 10.00 да 18.00, акрамя серады і выхадных, запрасіць Святлану), тэл.хатні 75-44-70 (штодня, з 19.00).

Шукаю працу на прадпрыемстве па падшыўцы і падклейванні падэшваў у абутку. Тэл. 31-77-41 (у любы зручны для вас час).

Здаю кватэру на суткі. Тэл. 72-07-40.

Здаю кватэру на суткі. Тэл. 72-07-70.

Страчаны вучнёўскі білет №316248 навучэнкі Гарадзенскай вучэльні мастацтваў Юліі Кагукінай лічыць несапраўдным.

Аддам шчанюкоў таксы ў добрыя рукі, без радаводу (1,5 месяца). Тэл. 5-65-44

Аддам прыгожае кацянятка ў добрыя рукі. Тэл. 33-65-75.

Прабачце тыя, хто тэлефанаваў на нумар 31-20-84, каб перапісаць CDZet «З Новым годам» і CD «Я нарадзіўся тут», а вам адказалі, што аб'явы не давалі. Гаспадыня кватэры не ведала. Але калі жаданне яшчэ не знікла, тэлефануйце і запрашайце да тэлефона Юлію. Тэл. 31-20-84.

## ЗНАЁМСТВЫ

Мужчына, 46/170/70, пазнаёміцца з адзінокай жанчынай ад 30 да 50 гадоў для шлюбу. Жылля не маю. Ёсць аўтамабіль. Пішыце на адрас: г.Гродна-11, п/п КН 0613648.

Адгукніся, адзінокая жанчына 48-52 гадоў, невысокага росту, няпоўная, матэрыяльна забяспечаная, як і я. Аферысткам не тэлефанаваць. Тэл. у Слоніме 3-11-41 (пасля 20.00).

Мужчына творчай спецыяльнасці, 43/178/75, пазнаёміцца з жанчынай для сяброўскіх сустрэчаў. Магчымы шлюб. Чакаю лісты на адрас: 231900, г.Ваўкавыск-6, а/с 9.

## ПАЖАДАННІ

Зычу вам перамагчы ў Гаспадарчым судзе цьмяныя сілы! Газета ПАГОНЯ мусіць выходзіць у свет! Ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі людзі пытаюцца, калі зноў на паліцах шапікаў з'явіцца патрэбнае белым русам выданне - газета ПАГОНЯ? Алесь Шустоўскі, г.Барысаў















# Анекдоты!

Цудоўнае адкрыццё зрабілі туркменскія мікрабіёлагі пасля 10-гадовага вывучэння пад мікраскопам малекулы вады. Выявілася, калі крыху падкруціць на мікраскопе колца, малекулу становіцца бачна куды лепш.

***

За дзвярыма аўдыторыі чуцен лісліві голас выкладчыка:

- Так, дзяўчына, расстаўце ногі, вазьміце інструмент у рукі і ўстаўце яго паміж ног. А цяпер плаўна: туды-сюды, туды-сюды. І расслабцеся: віяланчэль не церпіць ніякага гвалту...

***

Заблукалі два грыбнікі. Ледзьве перасоўваючы ногі, выйшлі яны на ўзлесак. А там прапаршчык стаіць. Яны ў яго пытаюцца:

- Таварыш вайсковец, мы на станцыю правільна ідзем?

- Ды дзе там правільна? Галёнкаступ віхляе, удар стапы недакладны, ды і ўвогуле, не ў ногу...

***

Ляжаць муж і жонка ў ложку. Жонка:

- Каханы, вазьмі мяне...

- Спі, родная, мы нікуды не едзем.

***

У рэстаране.

- Дазвольце запрасіць Вашу даму?

- Яна не танцуе.

- Ды якія танцы, у мяне ордэр на арышт!

***

Ляцяць у самалёце Пуцін, Кучма і Лукашэнка. Нечакана загараецца рухавік і самалёт пачынае падаць. Усе пачынаюць шукаць выратавальныя сродкі. Але выяўляецца, што ёсць толькі адзін парашут. Лукашэнка кажа: «Давайце арганізуем рэферэндум. Хто пабедзіт, тот і прыгнет с парашутам». Кучма і Пуцін пагадзіліся. Пашэнціла, натуральна, Лукашэнку. І той скочыў з парашутам. Самалёт працягвае падаць, а Кучма гаворыць Пуціну:

- Нешта, Валодзя, я не зразумею: нас тут трох было, а Рыгоравіч выйграў у нас з перавагай у дзесяць галасоў?..

**ПАГОНЯ купон прыватнай бясплатнай аб'явы**

| 39 | Імя і прозвішча ____________ |
|---|---|
| | Адрас (тэлефон) ____________ |
| | Рубрыка ____________ |
| | Тэкст ____________ |

Аб'явы, дасланыя на купонах, друкуюцца ў першую чаргу; неразборліва напісаныя аб'явы не друкуюцца

**Купон з тэкстам адпраўце па пошце на адрас: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11**

**Супрацоўнікі рэдакцыі ПАГОНІ нагадваюць чытачам, якія дасылаюць аб'явы ў рубрыку «Знаёмствы», пра неабходнасць указваць напрыканцы купона нумар паштовага аддзялення сувязі і сваёй абаненцкай скрыні, альбо пакідаць наступную інфармацыю: індэкс паштовага аддзялення, «да запатрабавання, прад'яўніку пашпарта ці іншага дакумента...»; ці прыходзіць у рэдакцыю з купонам аб'явы і сваім пашпартам.**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



# «Беркут» зачапіў ачко

**Чэмпіянат Усходне-Еўрапейскай Хакейнай Лігі 22-23 верасня**

**«Нёман»** (Гродна) - **«Беркут»** (Кіеў) - 4:1 (галы ў «Нёмана» закідвалі Мінін, Дубень, Белы, Сцефановіч), 2:2 (Лісічкін, Нічыухін).

**Нёман: Алейнікавас (Казачкін 18.01); Калмычкоў-Нічыухін, Чух-Смірноў-Дзееў; Пячонкін-Жданаў, Галавіноў-Сцефановіч(к)-Лісічкін; Сапівуз-Кулянок, Дубень-Пстыга-Сідараў; Бузыроў-Коршунаў, Мінін-Поліцінчскі-Белы; Лантрапаў, Чурабаеў.**

**У другой гульні замест Сапівуза гуляў Аўчыннікаў.**



Хакеісты «Нёмана» асаджаюць браму «Беркута»

Так здарылася, што першыя хатнія гульні віцэ-чэмпіёны Усходне-Еўрапейскай Хакейнай Лігі хакеісты «Нёмана» правадзілі з чэмпіёнам «Беркутам». Было цікава, у якім стане падышлі да чэмпіянату мінулагодняя «заканадаўцы мод». Трэба прызнаць, што абодва клубы яшчэ далёкія ад сваёй найлепшай формы.

Гульням папярэднічалі правадзіны з хакея (з прычыны шматлікіх траўмаў) гарадзенца Ільшата Кадырава. За восем сезонаў у складзе «Нёмана» Ільшат стаў чэмпіёнам УЕХЛ, тройчы чэмпіёнам Беларусі і шасціразовым уладальнікам Кубка Беларусі «Крыніца». Паслужны спіс Кадырава ў чэмпіянаце УЕХЛ складае 174 гульні, у якіх ён закінуў 60 шайбаў і адаў 53 галявыя перадачы, а ў нацыянальным першынстве - 92 гульні, 44 шайбы, 23 перадачы. Поспехаў табе, Ільшат надалей!

Ад самага пачатку суботняй гульні хакеісты «Нёмана» навязалі суперніку жорсткі хакей, што з'явілася для кіеўлянаў пэўнай нечаканасцю. Ініцыятыва цалкам належала гарадзенцам. На 16-й хвіліне нёманцы павялі ў ліку (2:0). Індывідуальным майстэрствам вызначыліся Віктар Мінін і Дзмітрый Дубень. Першы выкарыстаў выхад «два ў аднаго», другі - развёў па розных кутках шайбу і брамніка «Беркута» Фёдарава. Пачатак другога перыяду выклікаў буру эмоцыяў на лаўцы запасных кіеўлянаў. Галоўны суддзя Кунейкіс памыліўся ў выпадку, калі брамнік «Нёмана» Арунас Алейнікавас выкінуў шайбу з брамы, якая ўжо перасекла «стужачку». У трэцім перыядзе кіеўляне адквіталі адзін гол і, здавалася, што для «Нёмана» надыдуць цяпер цяжкія хвіліны. Аднак усе пытанні наконт пераможца зняў наш капітан Ігар Сцефановіч, усталяваў канчатковы лік гульні.

Другая гульня прайшла з пераменным поспехам. Супернікі пераменку выходзілі наперад. З кожнай хвілінай напал гульні ўзрастаў. Пасля таго, як за 11 хвілінаў да канца асноўнага часу гульні «Беркут» аднавіў раўнавагу, гарадзенскія гледачы сталі сведкамі першага ў чэмпіянаце пяціхвіліннага овер-тайму, у якім лік не змяніўся перш за ўсё дзякуючы ўдалай гульні брамнікаў Алейнікаваса і Фёдарава. Яны па выніках дзвюх гульняў і былі прызнаны лепшымі хакеістамі ў сваіх камандах.

Гульні з «Беркутам» відавочна прадэманстравалі складанасці «Нёмана» ў наяўнасці тэхнічных цэнтральных нападнікаў. З адыходам у «Гомель» Алега Малашкевіча не могуць знайсці ўзаемаразумення і хакеісты нашага першага звяна, якія правялі гэтыя гульні на «нуль». Затое ўзрадавалі нашыя хакеісты добрай рэалізацыяй большасці.

## Каментары да гульні



**Анатоль Варывончык** (галоўны трэнер «Нёмана»):

*- Я мяркую, што гульні былі ў «роўных» момантах. Спарынгавыя гульні на добрым узроўні правесці цяжка. Бо яны патрабуюць немалых высілкаў. У першай гульні ў нас працэнт рэалізацыі быў высокі. Нядзельны нічыйны вынік выглядае заканамерным.*



**Сяргей Лубнін** (галоўны трэнер «Беркута»):

*- Па суме дзвюх гульняў вынікам задаволены. Задачу «зачапіць» у Гродне ачко выканалі. «Нёман» згуляў на сваім узроўні.*

**Турнірная табліца**

| | Г | П | ПО | Н | По | П | Ш | А |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сокал | 6 | 3 | 0 | 0 | 0 | 3 | 18-29 | 9 |
| Нёман | 4 | 2 | 0 | 1 | 0 | 1 | 13-8 | 7 |
| МГУ | 4 | 2 | 0 | 0 | 1 | 1 | 15-12 | 7 |
| Палімір | 4 | 2 | 0 | 0 | 1 | 1 | 13-14 | 7 |
| Керамін | 4 | 1 | 1 | 1 | 0 | 1 | 11-10 | 6 |
| Гомель | 4 | 2 | 0 | 0 | 0 | 2 | 13-15 | 6 |
| Рыга | 4 | 1 | 0 | 1 | 0 | 2 | 15-15 | 4 |
| Металургс | 2 | 1 | 0 | 0 | 0 | 1 | 5-4 | 3 |
| Беркут | 4 | 0 | 1 | 1 | 0 | 2 | 11-14 | 3 |

**Заўвагі: Г- гульні, П - перамогі, ПО - перамогі ў овер-тайме, Н - нічые, По - паразы ў овер-тайме, П - паразы, Ш - шайбы, А - ачкі.**

## Расклад гульняў «Нёмана» на першым этапе ў чэмпіянаце УЕХЛ

**Хатнія гульні**

12-13 кастрычніка **«Рыга»**
13-14 лістапада **«Палімір»** (Навапалацк)
19-20 лістапада **«Металургс»** (Ліепая)
16-17 снежня **МГУ** (Масква)
18-19 студзеня **«Сокал»** (Кіеў)
2-3 лютага **«Гомель»**.
14-15 лютага **«Керамін»** (Менск)

**Гульні на выездзе**

5-6 кастрычніка **«Керамін»**
27-28 кастрычніка **«МГУ»**
25-26 лістапада **«Гомель»**
8-9 снежня **«Палімір»**
12-13 студзеня **«Беркут»**
27-28 студзеня **«Металург»**
21-22 лютага **«Рыга»**
22 снежня - гульня **«Усіх зорак»** (Латвія)

На другім этапе васьмёрка мацнейшых па сістэме плэй-оф разыграе медалі.

# Цукровы камбінат знаходзіцца у кроку ад Кубка УЕФА

**У суботу, 22 верасня, футбалісты Скідальскага цукровага камбіната выйшлі ў фінал рэгіянальнага Кубка Беларусі сярод мацнейшых камандаў. У сваю чаргу перамога ў фінале Кубка дае права пераможцу прадстаўляць нашу краіну ў Кубку УЕФА сярод аматарскіх камандаў.**

Паўфінальныя сустрэчы скідальскія футбалісты праводзілі ў Менску з камандай «Арбіта». Асноўны і дадатковы час скончыўся лікам 2:2, і толькі па серыі пасляматчавых адзінаццаціметровых нашыя землякі вырвалі перамогу - 4:2.

Шостага кастрычніка ў Нясвіжы адбудзецца фінал, дзе супернікам нашых футбалістаў будзе пераможца пары «Харчавік» (Ганцавічы) - «Зорка» (Мар'іна Горка).

# ПЕБЛ у Гродна не прыедзе?

**Сёмага-восьмага кастрычніка ў Гродне баскетбалісты «Гродна-93» павінны праводзіць першыя гульні ў сваёй групе ў Паўночна-Еўрапейскай Баскетбольнай Лізе супернікаў. Аднак гульні нашай каманды з камандамі «Калеў» і «Хонкай» гарадзенцы могуць і не ўбачыць.**

Справа ў тым, што да гэтага часу не вырашана пытанне адносна набыцця сучаснага баскетбольнага паркету, на якім можна было б праводзіць гульні ПЕБЛ у Лядовым палацы. А гэта з'яўляецца адным з галоўных патрабаванняў кіраўніцтва Лігі. Таму ўжо зараз разглядаюцца варыянты правядзення хатніх гульняў «Гродна-93» у другіх гарадах - Алітусе, Менску, Вільнюсе.

Нягледзячы на ўсё гарадзенцы працягваюць узмацняцца. У панядзелак подпісы на кантрактах з «Гродна-93» паставіў баскетбаліст нацыянальнай зборнай Беларусі Арсеній Кучынскі ды літоўскі цэнтравы Томас Венскунас.

Такім чынам у міжсезонні нашу каманду пакінулі Аляксей Жармухамедаў, Андрэй Клемезь, Пётр Крышчык і Раман Сафронаў. На іх месца прыйшлі Эльгеркус Каваляонас, Максім Цішанкоў, Арсеній Кучынскі, Спартак Паграбнёў, Томас Венскунас, Кірыл Місючэнка і Пётр Сарасек.

Тым часам гарадзенцы сур'ёзна рыхтуюцца да сустрэчаў чэмпіянату ПЕБЛ. На мінулых выходных «93-я» ў Алітусе занялі другое месца ў даволі моцным па складзе міжнародным турніры.

Нашыя баскетбалісты атрымалі перамогі над шведскім «Далфінсам» (84:71), эстонскім «Хатроніксам» (82:54) і прайгралі гаспадарам - «Алітусу» з лікам 68:73. Самым выніковым баскетбалістам у складзе нашай каманды стаў Дзяніс Коршук, які ў трох гульнях набраў 40 ачкоў. Трэба адзначыць, што не выязджалі ў Літву Кучынскі (не паспелі аформіць візу) і з-за хваробы - Квашчук і Місючэнка.

Апошнім выпрабаваннем перад дэбютам у чэмпіянаце ПЕБЛ для «93-х» будуць гульні фіналу Кубка Беларусі, якія адбудуцца 29-30 верасня ў спарткомплексе «Вікторыя».

# Дзяўчыны супраць жанчын

**У пятніцу, 28 верасня, чэмпіёнкі нашай краіны, баскетбалісткі гарадзенскай «Алімпіі» ад'едуць у Санкт-Пецярбург, дзе на наступны дзень сустрэчай з «Балканскай зоркай» распачнуць VIII чэмпіянат Балтыйскай Лігі. У нядзелю суперніцамі нашых баскетбалістак будуць віцэ-чэмпіёнкі Расеі - каманда «Хваля».**

*- Цяжка на штосьці разлічваць, калі ў нашай камандзе самай сталай баскетбалісткі Надзеі Дрозд усяго 18 гадоў, -* гаворыць ПАГОНІ **Аляксандр Шымкаваяк**, галоўны трэнер «Алімпіі». *Аднак «хлапчукамі» для біцця не будзем.*

Сапраўды, селекцыйную работу нашага клуба ў міжсезонні інакш як правальнай назваць нельга. Каманду пакінулі мінулагоднія лідаркі - Святлана Гапонава, Кацярына Шупляцова, якія ўжо падпісалі кантракты з віцэ-чэмпіёнкамі Беларусі барысаўскай «Беразіной». Вольга Курсевіч шукае сабе новы клуб у Босніі.

*- За тыя капейкі, што мне прапанавалі ў «Алімпіі», я гуляць не збіраюся. Пакуль з кіраўніцтвам клуба існуе дамова, што да новага года я буду гадаваць сваё малое дзіця, а клуб за гэты час паспрабуе вырашыць фінансавае пытанне, -* адзначыла ПАГОНІ адна з лепшых баскетбалістак Гарадзеншчыны **Таццяна Траско.**

Такім чынам, ні на каго акрамя як на сваіх асабістых выхаванак 1985 года нараджэння Аляксандр Шымкаваяк у папаўненні чэргаў «Алімпіі» разлічваць не можа. А іх ужо зараз - палова каманды. Што ж, будуць працаваць **на перспектыву.**

**Выязны склад «Алімпіі»:** Надзея Дрозд, Вольга Цярэнцьева, Наталля Фядотова, Ганна Мацкевіч, Наталля Багдановіч, Лідзія Панасюк, Ірына Шамрэй, Ірына Аўрамчык, Таццяна Баркоўская, Вольга Кузьмянкова.

# «Нёман» захоўвае пазіцыю

**Нягледзячы на незапланаваную страту двух ачкоў у чарговай гульні чэмпіянату Беларусі з віцебскім «Лакаматывам-96» (1:1) футбалісты «Нёмана» захоўваюць трэці радок у чэмпіянаце. Ачко нёманцам прынёс гол Дзмітрыя Кавалёнка.**

*- Гэта самая дрэнная гульня ў выкананні «Нёмана», якую я памятаю, -* каментуе ПАГОНІ вынік гульні галоўны трэнер «Нёмана» **Сяргей Саладоўнікаў**, *- пасля такіх гульняў трэнера і ўвозяць у шпіталь з інфарктам. У чым прычына такой дрэннай гульні нашых футбалістаў? Не ведаю. Магчыма, гэта збег абставінаў. Адказ на гэтае пытанне павінна даць хатняя гульня з «Тарпеда». У сваю чаргу, мы ўжо ўнеслі некаторыя карэктывы ў трэніровачны працэс, якія павінны паспрыяць выйсцю з гэтага становішча.*

**Турнірная табліца чэмпіяната Беларусі па футболу**

| | Г | П | Н | П | А |
|---|---|---|---|---|---|
| Белшына | 19 | 14 | 3 | 2 | 45 |
| БАТЭ | 18 | 13 | 2 | 3 | 41 |
| Нёман | 19 | 10 | 6 | 3 | 36 |
| Дынама (Менск) | 19 | 10 | 4 | 5 | 34 |
| Славія | 19 | 10 | 3 | 6 | 33 |
| Тарпеда-МАЗ | 18 | 9 | 4 | 5 | 31 |

# «Камунальнік» пачаў з перамог

**Дзве перамогі атрымалі валейбалісты «Камунальніка» ў стартавых гульнях 11-га чэмпіёна Беларусі па валейболе. З аднолькавым лікам 3:0 гарадзенцы 22-23 верасня ўзялі верх над менскім «РВАРам».**

Прымалі ўдзел у гэтых гульнях два навічкі гарадзенцаў - Віктар Бекша і Алег Міканові, якія апошні сезон правёў за гомельскі «СКА». А вось Святаслаў Міклашэвіч удзел у гульнях не прымаў. Прычына - адсутнасць дакументаў пра пераход Святаслава з яго былога клуба «Дынама» (Белагор`е) у «Камунальнік». Аднак, паводле словаў прэзідэнта нашага клуба Леаніда Андрушкі, гэтая недарэчнасць у хуткім часе будзе вырашана.

**Другі тур 29-30 верасня спарткомплекс «Вікторыя» «Камунальнік» - «Металург» (Жлобін).**

**Падрыхтаваў Дзяніс Курчэўскі**




ПАГОНЯ
Заснавальнік: Гродзенскае грамадскае аб`яднанне "Бацькаўшчына"

Адрас рэдакцыі: 230025, г. Гродна, вул. К. Маркса, 11. Тэл.72-37-14, 72-35-61, факс 72-29-96. E-mail: pagonia@irex.minsk.by Падпісны індэкс: **63124.**

Рэгістрацыйны нумар 597. Нумар газеты надрукаваны ў Гарадзенскім абласным унітарным паліграфічным прадпрыемстве «Гродзенская друкарня» Адрас: 230023, г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4. Нумар падпісаны да друку ў 16.00 26.09.2001 г. Замова 2 680 Наклад 8 132

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі. Якасць друку адпавядае пададзеным рэдакцыяй дыяпазітывам. Аб`ём - тры ўмоўныя друкарскія аркушы.

Галоўны рэдактар **Мікола Маркевіч**

Кампутарны набор: **Ірына Салей**
Кампутарная вёрстка: **Аляксей Салей**

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013